Пролетары усіх краеў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Прыём ад 9-й да 3½ гадз.

Неразабранае рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. місцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі перад тэксту 1 р. — к. За радок шапарэлі вераг тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя па 50 проц. дарожэй. Зьніж тарыфу бяруцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 47 (2235) Пятніца, 24-га лютага 1928 г.

Польшча перад выбарамі.

У Польшчы надыходзяць выбары сойму, і перадвыбарчая кампанія зьчуляецца тою восьсю, навакол якой круціцца зараз палітычнае жыцьцё краю.

Ня трэба, аднак, думаць, што вынік выбараў здолее зрабіць які-небудзь уплыў на лёс сучаснага польскага ўраду. Не, фашысцкая ваеншчына, якая стаіць зараз ва ўладзе і захваціла ўладу ды дапамозе вайсковага перавароту, не падначальваецца і ня будзе падначальвацца сойму. Сойм патрэбны Пілсудзкаму, так сказаць, «для маблі», для захаваньня бачнасьці парляманцкага ладу ў Польшчы.

Аб усім гэтым і ўрадавы друк, і сам Пілсудзкі, і яго міністры гаварылі заўсёды з поўнаю адкрывеннасьцю. З поўнаю адкрывеннасьцю зьдекваюцца яны над парляманцкімі парадкамі і зараз. Але тым больш каштаўнаю будзе навука, якую нават найбольш адсталыя групы польскай рабочай клясы і сялянства пачуць з сучаснай перадвыбарчай кампаніі.

Як вядома, згоднікі ўсіх краёў на ўсіх скрыжаваньнях заяўляюць, што, бач, адзіны шлях да палепшаньня становішча працоўных і нават да сацыялізму, гэта—«дэмакратыя», інакш кажучы, парлямант, парляманцкія выбары. Польская перадвыбарчая кампанія і адкрывешныя зьдзекі Пілсудзкага над соймам выразна выкрываюць гэтую згодніцкую ману.

Перадвыбарчая кампанія ў Польшчы зьяўляецца новым яскравым пасьведчаньнем запраду і набліжэньня ліквідацыі парляманцкага ладу. Яна наглядна паказвае, што пралетарыяту не даводзіцца ўскладаць на яго якія-небудзь надзеі.

З гэтага, аднак, ня выплывае, што рабочыя і сяляне не павінны браць удзелу ў выбарах. Удзел у выбарах зьяўляецца важнай палітычнай дэманстрацыяй пралетарыяту. Выбары згуртоўваюць рады пралетарыяту і хоць далёка не дакладна, але за тое вельмі наглядна падлічваюць яго сілы.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага мае шмат падстаў не жадаць такога нагляднага падліку.

Як вядома, Пілсудзкі ўчыніў свой пераварот (у маі 1926 г.) пад лёзунгам «аздараўленьня» дзяржавы. Адсталая частка рабочай клясы спадзявалася, што «аздараўленьне» дзяржавы будзе азначаць і некаторае палепшаньне становішча рабочых. Сяляне думалі, што «аздароўчыя» мерапрыемствы Пілсудзкага забясьпечаць ім атрыманьне памешчыцкай зямлі. Згоднікі энэргічна падтрымлівалі гэтыя надзеі.

Усё-ж такі надзеі, зразумела, не ажыцьцявіліся. Пілсудзкі ня даў сялянам памешчыцкай зямлі. Наадварот, ён ўтварыў нічыльны саюз з манархічным памешчыцкім магнацтвам. Ён ня спыняе палітыкі прыгнечаньня на ўсходніх крэсах, заселеных украінцамі і беларусамі. Ён разграміў Беларускую Рабоча-Сялянскую Грамаду. Ён уціскае далей рэвалюцыйны рабочы рух.

Вынікам зьяўляецца, зразумела, рост рэвалюцыйных настрояў і заняпад уплыву згоднікаў сярод пралетарыяту. І тое і другое было ўжо наглядна засьведчана леташнімі выбарамі ў праўленьні бальнічных кас і гарадзкія ўправы Варшавы, Лёдзі і іншых гарадоў.

Пілсудзкі добра разумее, што надыходзячыя соймавыя выбары павінны паказаць тое самае. Ня дзіва, што ён усімі сіламі імкнецца мерашкодзіць перадавым групам пралетарыяту ўзяць у іх удзел.

Камуністы наогул ня могуць адкрыта выступаць на выбарах. Іхнія кандыдаты выступаюць у сьпісе рабоча-сялянскага адзінства. І ўсе сілы ўраду, паліцыі і охранкі накіраваны на тое, каб не дапусьціць абраньня кандыдатаў гэтага сьпісу.

У шмат якіх райёнах сьпіс гэты скасаваны, г. зн. галасы, якія будуць пададзены за яго, загадзя абвяшчаюцца неправамоцнымі. Усюды мітынгі, якія склікаюцца прыхільнікамі гэтага сьпісу, разганяюцца. Усюды яго адозвы канфіскуюцца. У Вільні рабочы, які агітаваў за сьпіс рабоча-сялянскага адзінства, быў забіт паліцэйскім агентам.

Не зважаючы на гэта, ужо самая барацьба навакол рабоча-сялянскага сьпісу мае вялікае рэвалюцыйнае значэньне.

Урадавы друк, напрыклад, з занепакоеньнем зазначае, што ў Дамброўскім вуглянрамысловым райёне «пераважаючая большасьць галасоў будзе пададзена, як відаць, за рэвалюцыйны сьпіс». Настрой дамброўскага пралетарыяту такі, што згоднікі нават не адважваюцца склікаць там свае мітынгі...

Але Дамброўскі райён — не адзіны цэнтр выбраньня рэвалюцыйных сіл у Польшчы.

Рух у Амэрыцы за прызнаньне СССР.

Барацьба плыняў за і проці прызнаньня.

НЬЮ-ЁРК, 21-II. Заява Форда на карысьць прызнаньня СССР і іншыя адзнакі зацікаўленасьці да гандлю з СССР часова зацямнілі сілы ворагаў гэтага прызнаньня, якія, аднак, паранейшаму пераважаюць сваім уплывам на палітыку ўраду. У прамысловых і банкаўскіх колах Злучаных Штатаў наглядаюцца супярэчлівыя адносіны да СССР і да пытаньня аб яго прызнаньні. Так, напрыклад, на ўсіх краі мясцовыя гандлёвыя палаты навыперадкі запрашаюць Сьміта (прадстаўнік расейска-амэрыканскае гандлёвае палаты) для дакладаў, а старшыня нацыянальнае гандлёвае палаты супярэчыць проці гэтае прапаганды пад кіраўніцтвам Рокфэлера на карысьць СССР.

Такая-ж супярэчнасьць прасочваецца і ў ўчынках кандыдата ў прэзыдэнты Гувэра. У апошнія гады Гувэр вялікіх заяў пра свае адносіны да СССР не рабіў і гэтым спрыяў зьяўленьню супярэчлівым паведамленьням. У некаторых паведамленьнях зазначалася, што Гувэр—за прызнаньне, а ў другіх,—што ён проці. Сам Гувэр усё яшчэ маўчыць, але адна частка яго блізкіх супрацоўнікаў настроена варожа да СССР, а другая прыяцельскі. Такое становішча не супярэчыць лёгіцы, бо Гувэр у якасьці міністра гандлю прадстаўляе інтарэсы прамыслоўцаў, якія шукаюць рынкаў, і ён-жа адначасна—кампаньён Уркварта, зацікаўленага ў звароце належаўшых яму уральскіх заводаў. Усюды ў эканамічнай, палітычнай і культурнай галінах гэтыя супярэчлівыя тэндэнцыі праходзяць чырвонаю ніткаю. Банкет у клюбе банкіраў і іншыя мерапрыемствы сьведчаць аб зьмене эканамічнае сітуацыі, але значэньня іх ня трэба перавялічваць.

АМЭРЫКАНСКІ ПІСЬМЕНЬНІК ДРЭЙЗЭР АБ СССР.

НЬЮ-ЁРК, 22-II. Вядомы амэрыканскі пісьменьнік Дрэйзэр, які вярнуўся з СССР, дзе прысутнічаў на кастрычнікавай урачыстасьці, у гутарцы з прадстаўнікамі друку з надзвычайнаю пахвальбою гаварыў пра дасягненьні савецкага ўраду і пра задачы, якія ён ставіць перад сабою. Зазначыўшы, што ён не камуніст, Дрэйзэр заявіў, што калі «капіталісты Амэрыкі не забясьпечаць амэрыканскіх рабочых харчамі і кватэраю, дык у іх вырасьце такая-ж клясавая самасьвядомасьць, як і ў расейскіх рабочых у 1917 г.».

КРОК ДА ПАШЫРЭНЬНЯ ГАНДЛЮ МІЖ СССР І ЧЭХАСЛАВАКІЯЙ.

ПРАГА, 22-II. Пленум камісіі савецка-чэхаславацкае гандлёвае палаты па імпорце выказаўся за патрэбу ўтварыць пастаянны гандлёвы ўгавор між СССР і Чэхаславакіяй на аснове ўзаемнага даньня ўгаворным баком правоў найбольшага спрыяньня. Пленум абраў спэцыяльную камісію, якой даручана арганізаваць экспортна-імпортнае гандлёвае таварыства дзеля гандлю з СССР.

Муніцыпалітэт у Брно (цэнтр прамысловасьці правінцыі Маравіі) выказаўся за ўзмацненьне гандлёвых зносін між СССР і Чэхаславакіяй.

Савецкі Саюз у дні слаўнае гадавіны.

Ордэн Чырвонага Сьцягу т. т. Калініну, Пятроўскаму і Рыкаву.

У зьвязку з 10-мі ўгодкамі Чырвонае арміі прэзыдыум ЦВК СССР, згодна прадстаўленьня Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету, узнагарадзіў ордэнам Чырвонага Сьцягу старшыню ЦВК СССР Калініна, старшыню ЦВК СССР і Усеўкраінскага ЦВК Пятроўскага і старшыню СНК СССР Рыкава, як вышэйшых кіраўнікоў абароны краю і натхняцеляў Чырвонае арміі ў яе цяжкай барацьбе з ворагамі пралетарыяту.

Гэтая пастанова падасьцца на зацьверджаньне бліжэйшае сэсіі ЦВК СССР.

Узнагарода гэроям Чырвонае арміі.

МАСКВА, 22-II. За подпісам Наркома па Вайсковых і Марскіх справах і старшыні Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР тав. Варашылава агалошаны два загады аб узнагародзе гэрояў Чырвонай арміі.

Загадам за № 101 паведамляецца аб узнагародзе ЦВК'ам СССР ордэнам Чырвонага Сьцягу 989-ці найлепшых выдатных абаронцаў Кастрычніка, як з тых, што знаходзяцца зараз у кадрах РСЧА, так і тых, якія знаходзяцца па-за ле шэрагамі.

Загадам за № 102 Рэвалюцыйны Вайсковы Савет СССР узнагароджае рознымі падарункамі і ганаровымі граматамі найбольш выдатных абаронцаў пралетарскае рэвалюцыі, якія лічацца ў кадрах РСЧА, так і тых, што знаходзяцца па-за ле шэрагамі. Сьпісы гэтых асоб будуць агалошаны ў бліжэйшых нумарох газэты «Красной Звезды».

Вітань узброеным рабочым і сялянам ад т. Рыкава.

Рабочая кляса СССР у ўзброенай барацьбе з капіталістамі і земляўласьнікамі прайшла шлях ад арганізацыі пераможнага паўстаньня да арганізацыі Чырвонае арміі сацыялістычнае рэвалюцыі. У барацьбе клясаў перамогі Чырвонае арміі забясьпечылі дыктатуру пралетарыяту і пачатак сацыялістычнага ператварэньня грамады. У гэтай жа барацьбе яна забясьпечыць і канчатковую перамогу сацыялізму.

Прывітаньне ўзброеным рабочым і сялянам. Прывітаньне Чырвонай арміі і Чырвонаму флёту.

Падзяка працаўніком Чырвонага Крыжу РВС.

МАСКВА. Рэвалюцыйны Вайсковы Савет СССР і НК аховы здароўя РСФСР у загадзе выказваюць удзячнасьць арганізацыі Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу за дзейную санітарную дапамогу Чырвонай арміі ў гады цяжкае барацьбы на франтох грамадзянскае вайны і выказваць упэўненасьць, што ў справе аховы здароўя Чырвонае арміі і санітарнае абароны краю спаткаюць і надалей у памянёных арганізацыях саму дзейную дапамогу.

За асаблівую актыўнасьць у галіне санітарнае працы і абароны краю ў памянёных арганізацыях выказваецца ўдзячнасьць старшыні выканкому саюзу т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу Энукідзэ, старшыні ЦК Салаўёву, старшыні ўкраінскага ЦК Чырвонага Крыжу Буцэнку, старшыні ЦК беларускага Чырвонага Крыжу Барсукову, старшыні ЦК грузінскага Чырвонага Крыжу Кіткілішылі, старшыні армянскага Чырвонага Крыжу Амсараканцу, старшыні ЦК Чырвонага Паўмесяцу Гусецкаму, старшыні ЦК туркменскага Чырвонага Паўмесяцу Абундаеву і старшыні ЦК узьбекістанскага Чырвонага Паўмесяцу Асупбабаеву.

Абяцаньне кіеўскага студэнцтва і прафэсуры.

КІЎ, 22-II. Сёньня адбыўся ўрачысты сход студэнцтва і прафэсуры, прысьвечаны 10-й гадавіне Чырвонае арміі. Ва ўхваленай рэзалюцыі студэнты і прафэсура заяўляюць, што яны аддадуць усе свае сілы справе далейшага ўзмацненьня абароны СССР.

Палёгкі азэрбайджанскім чырвонагвардзейцам.

БАКУ, 22-II. Азэрбайджанскі ЦВК ухваліў пастанову аб шэрагу палёгак для ранейшых чырвонаармейцаў і чырвонагвардзейцаў.

Палёгкі чырвоным партызанам Закаўказьзя.

ТЫФЛІС, 22-II. Прэзыдыум Закаўкаскага ЦВК, у адзнаку 10-е гадавіны Чырвонае арміі, ухваліў пастанову, у якой установлен для ранейшых чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў, а таксама сем'яў, якія пасьля іх засталіся, шэраг льгот.

Моцна трымайце сьцяг барацьбы.

Адозва украінскага ўраду.

ХАРКАЎ, 22-II. Прэзыдыум усеўкраінскага ЦВК і СНК зьвярнуўся да ўсіх працоўных Украіны з адозвай з прычыны 10-годзьдзя Чырвонае арміі. Адозва прыпамінае гісторыю і ўмовы барацьбы Чырвонае арміі ў прыватнасьці на Украіне, перачлівае задачы, якія стаяць перад Чырвонаю арміяю, і ў канцы заклікае ўсіх рабочых, сялян і чырвонаармейцаў Украіны моцна трымаць чырвоны сьцяг камуністычнае барацьбы, зачачаваць братэрскі саюз працоўных, садзейнічаць васьнізацыі жыхароў, навышэньню баявое магутнасьці савецкага краю, рацьвіцьцю савецкае грамадзянасьці вакол пытаньняў абароназдольнасьці, пільна ахоўваць савецкія межы і быць заўсёды гатовымі да абароны вялізарнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Прывітаньне юбіляра тав. Куйбышавым.

Вітаю гэраічную Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію ад імя сацыялістычнае прамысловасьці. Нашая прамысловасьць заўсёды будзе баявым памоцнікам Чырвонае арміі ў будучых бойках з ворагамі рабочае клясы. Усю тэхнічную магутнасьць, усе вытворчыя рэсурсы на першым закліку партыі і краю прамысловасьць аддасьць на патрэбы абароны—на абарону заваёў Кастрычніка.

Нахай жыве непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная армія!

Адзнака гадавіны ў Узьбекістане.

САМАРКАНД, 22-II. У адзнаку 10-годзьдзя Чырвонай арміі ўрад Узьбекістану праводзіць шэраг мерапрыемстваў для палепшаньня быту Чырвонае арміі.

У зьвязку з юбілеем узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сьцягу 25 чалавек кампалітскладу Чырвонае арміі Сярэдня-Азіяцкага вокругу, каштоўнымі падарункамі ўзнагароджана 50 чалавек. Ганаровымі граматамі за актыўную барацьбу з басмацтвам узнагароджана 28 дэхкан (сялян).

Калі адбудзецца 1-ы тыраж сялянскай пазыкі.

Цэнтральная Камісія садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі пры ЦВК СССР узбудзіла хадайніцтва перад ЦВК СССР аб перанясеньні 1-га тыражу пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі з 1 кастрычніка на 1 мая 1928 г.

Пачаўся працэс Грамады.

ПРАЦЭС ГРАМАДЫ--СУД НАД БЕЛАРУСКІМ НАРОДАМ.

ВІЛЬНЯ, 23-II. СЁНЬНЯ Ў ВІЛЕНСКІМ АКРУГОВЫМ СУДЗЕ ПАЧАЛАСЯ СЛУХАНЬНЕМ СПРАВА 56 ЧЛЕНАЎ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДЫ, У ТЫМ ЛІКУ 4 ДЭПУТАТАЎ. НА СУД ВЫКЛІКАНА З АБУДВЫХ БАКОЎ 660 СЬВЕДАК. БОЛЬШАЯ ЧАСТКА АБВІНАВАЧАНЫХ—БЕЗЗЯМЕЛЬНЫЯ І МАЛАЗЯМЕЛЬНЫЯ СЯЛЯНЕ І БАТРАКІ. ПАКАЗАНЬНІ СВАЕ АБВІНАВАЧАНЫЯ ДАЮЦЬ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ. У ЗАЛЮ СУДУ ДАПУСКАЕЦЦА ПА БІЛЕТАХ ТОЛЬКІ БЛІЗКАЯ РАДНЯ ПАДСУДНЫХ. СЁНЬНЕШНІ ДЗЕНЬ БЫЎ ЗАНЯТЫ УСТУПНЫМІ ФАРМАЛЬНАСЬЦЯМІ. ХАРАКТЭРНЫМ МОМАНТАМ ПЕРШАГА ДНЯ ЗЬЯВІЛАСЯ ЗАЯВА ПАДСУДНАГА—ДЭПУТАТА РАКА-МІХАЙЛОЎСКАГА, ШТО, З ПРЫЧЫНЫ КАНФІСКАЦЫІ ПРЫ ЯГО АРЫШЦЕ ЯГО НЕВЯЛІКІХ ЗЬБЕРАЖЭНЬНЯЎ У БЕЛАРУСКІМ БАНКУ, СЯМ'Я ЯГО БЫЛА ВЫМУШАНА „ПРАДАЦЬ АСТАТНЮЮ МАЕМАСЬЦЬ — ПАЎТАРЫ ДЗЕСЯЦІНЫ ЗЯМЛІ.

З ПРЫЧЫНЫ ПРАЦЭСУ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДЫ АФІЦЫЁЗНАЯ «ЭПОКА» ПІША: «МАЕЦЦА НА УВАЗЕ, ШТО РАЗБОР ГЭТАЕ СПРАВЫ ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА МАЯ, З ПЕРАРЫВАМ У 12 ДЗЕН. СПРАВА ГРАМАДЫ—АДЗІН З САМЫХ БУЙНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ, ЯКІЯ ТОЛЬКІ БЫЛІ У ПОЛЬШЧЫ ЯК У АДНОСІНАХ ЛІКУ АБВІНАВАЧАНЫХ, ТАК І ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ».

Нажым пілсудчыкаў на выбаршчыкаў.

АРЫШТЫ СЯРОД ЧЛЕНАЎ «СЕЛЬРОБУ».

У Луцку палітычная паліцыя ізноў учыніла шмат арыштаў сярод членаў „Сельробу".

Арыштаваны: старш. акр. кам. Федарук, старш. райкому Война, кандыдат у паслы Гнябэнь і шмат іншых. Сканфіскована шмат дакумантаў.

РАЗГОН ЯЎРЭЙСКАГА МІТЫНГУ Ў ВАРШАВЕ.

З прычыны таго, што дырэкцыі тэатраў і кіно ня хочуць здаваць блёку нацыяналістаў сваіх заляў для прадвыбарчых мітынгаў, гэты блёк змушан свае мітынгі склікаць проста пад голым небам.

Такі мітынг быў склікан у нядзелю па Дзельнай вул., № 7.

Ні з таго, ні з сяго невядомыя асобы пачалі бойку. Паўстала паніка, і мітынг паліцыя скасіла.

КСЕНДЗ НАЧАЛЕ БАНДЫЦКАЙ БАЕЎКІ.

«Кур'ер Віленскі» паведамляе, што на скліканы блёкам нацыяналістаў мітынг уварвалася банда хуліганаў, якая разагнала мітынг і потым раскідала перад будынкам адозвы № 1, г. ё. «Блеку супрацоўніцтва з урадам».

Як потым аказалася, бандыцкі напад на мітынг быў падрыхтован правадырамі «Каталіцкага Блёку» з кс. Паганеўскім, рэд. «Новаго Жыцця», начле. Справа накіравана да пракурора.

БЕЛАРУСКІ ХАДЭК—І ТОЙ КАМУНІСТ.

«Дзеньнік Віленьскі» паведамляе, што ў Браславе арыштован член «ЦК Бел. Хр.-Дэмакратыі»—Дзьрэцкі, які пад відам прадпрыемчага агітуе праводзіў камуністычную агітацыю.

Грузінскія белагвардзейцы пад апекаю Пілсудзкага.

ВАРШАВА, 17-II. Афіцыёз «Эпока» паведамляе аб арганізацыі ў Варшаве „камітэту дапамогі грузінскім эмігрантам».

«Сярод польскае грамады,—піша афіцыёз,—грузінскія патрыёты, прымушаныя ў моц сучаснага становішча ў Расеі шукаць прытулку па-за бацькаўшчынаю, заўсёды знаходзілі жывыя сымпатыі».

Камітэт дапамогі абвяшчае, што ён «з удзячнасьцю зьбірае ахвяраваньні на патрэбы камітэту».

РАШАЮЧЫ МОМАНТ НЯМЕЦКАЕ СТАЧКІ.

ПРАМЫСЛОЎЦЫ НЕ АДМЯНЯЮЦЬ ЛЁКАУТУ, НЕ ЗВАЖАЮЧЫ НА АБАВЯЗКОВАСЬЦЬ ТРАЦЕЙСКАЕ ПАСТАНОВЫ.

БЭРЛІН, 22-2. Агульна-нямецкі саюз прадпрыемцаў мэталёвае прамысловасьці агаласіў заяву, у якой зазначана, што прадпрыемцы робяць належныя выводы з абвяшчэньня пастановы прымяраючае камеры абавязковаю і, паколькі гэта тэхнічна будзе магчыма, возьмуць усіх рабочых назад, ня ўціскаючы іх ніякімі рэпрэсіямі.

Аднак, зазначаецца далей у паведамленьні, у зьвязку з тым, што бастуючыя мэталёўцы Сярэдняе Нямеччыны, магчыма, не адновяць у поўным абхвате працы, не зважаючы на абвяшчэньне пастановы абавязковаю, абвешчаньне ўсеагульнага лёкауту не скасоўваецца, а толькі адкладаецца да 29 лютага.

У адказ на заяву агульна-нямецкага саюзу прадпрыемцаў аб адкладзе тэрміну абвяшчэньня лёкауту, саюз мэталёўцаў у Гальле зазначае, што зусім ня вырашана яшчэ пытаньне, ці можна разглядаць неадпаўленьне працы ў мэталёвай прамысловасьці Сярэдняе Нямеччыны, як незаконны працяг барацьбы, бо ўгаворныя ўзаемадачыненьні між прадпрыемцамі і рабочымі з прычыны лёкауту перарваны, і ўсе рабочыя фабрык звольнены.

МЭТАЛЁЎЦЫ БЭРЛІНУ ПАТРАБУЮЦЬ БАРАЦЬБЫ АД РЭФАРМІСТАЎ.

БЭРЛІН. Учора мясцовая дэлегацкая канфэрэнцыя агульна-нямецкага саюзу мэталёўцаў у Золінгене ўхваліла рэзалюцыю, у якой патрабуе, каб цэнтральны камітэт агульна-нямецкага саюзу мэталёўцаў распачаў неадкладна, супольна з агульна-нямецкім аб'яднаньнем прафсаюзаў, барацьбу проці трацейскае пастановы і проці абвешчанага прадпрыемцамі агульнага лёкауту ў нямецкай мэталёвай прамысловасьці.

ВАКОЛ ПАДЗЕЙ У КІТАІ.

АСАДА ГУІЛІНЯ КАМУНІСТЫЧНЫМІ АТРАДАМІ.

НЬЮ-ЁРК, 22-II. Кантонскі карэспандэнт «Асашыэйтэд Прэс» паведамляе, што камуністычны атрад лікам у 14 тысяч чалавек, прыехаўшы з правінцыі Хунань, асаджае Гуілінь (у паўночна-ўсходнім кутку правінцыі Гуансі).

МАРЫ ЧАН-КАЙ-ШЫ АБ ПЕКІНЕ.

ШАНХАЙ, 20-II. Прыехаўшы ў Нанкін Чан-Кай-Шы заявіў, што на нарадзе з Фынь-Юй-сянам і прадстаўнікам Ен-Сі-шана ў Кайфыне дасягнута канчатковая згода аб супольных апэрацыях усіх 3-х армій. Чан-Кай-шы спадзяецца заняць Пекін праз 3 месяцы.

СКЛАД РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ЛІТАРАТУРЫ Ў ХАНЬКОЎ.

ШАНХАЙ, 22-2. У Ханькоў канфіскавана некалькі пукоў рэвалюцыйнае літаратуры. Шанхайская паліцыя ўчыніла вобыскі на двух вуліцах міжнароднага кварталу. Па заяве паліцыі пры вобыску знойдзена шмат рэвалюцыйнае літаратуры на кітайскай і ангельскай мовах.

АРЫШТ І ВЫСЫЛКА ЯПОНСКАГА КАМУНІСТА.

ШАНХАЙ, 22-2. Згодна загаду японскага консула арыштаваны японскі камуніст Накамура, які пад вартай пераслан у Нагасакі.

Працэс Гары Сінклера.

ВАШЫНГТОН, 22-II. Скончылася справа вядомага нафтапрамыслоўцы Гары Сінклера, які быў пад судом за хабар былому міністру ўнутраных спраў Фолу з мэтаю атрымаць нафтавую канцэсію. [illegible] справе Сінклера былі таксама [illegible]ты Генры Мэзон [illegible]ьямс Бэрнс (былы [illegible]кае паліцыі) і [illegible]альнік прыватнае [illegible]скае арганізацыі) [illegible] справе зрабіць на[illegible] агляде справы Сінклера. Сыскныя агенты Бэрнса запужвалі сяброў суду, каб прымусіць іх ухваліць добрую пастанову па справе Сінклера. Гэта выявілася, і быў назначан новы склад суду.

Сінклер засуджан на 6 месяцаў астрогу. Мэзон—на 4 месяцы, Вільямс Бэрнс—на 15 дзён, Шэрман Бэрнс—да штрафу ў тысячу даляраў.

З прычыны таго, што абвінавачаныя падалі касацыйную скаргу, да новага разгляду справы яны застаюцца на волі.

[illegible]ы югаслаўскі ўрад.

[illegible] 12-цідзённага [illegible]каазіцыйн[illegible] Вукі[illegible]кічэвіча [illegible] Марын[illegible]цыйны ўрад. Місія Марынковіча пацярпела няўдачу з прычыны таго, што партыя Радзіча патрабавала для сялянска-дэмакратычнае каазіцыі ня менш 7 партфоляў за ўрадзе.

За дзень.

Вакол пытаньня аб разброеньні.

Канкрэтныя прапановы тав. Літвінава аб канчатковым разброеньні ў працягу 4-х год узбудзіла грамадзкую думку ня толькі Эўропы, але і ўсяго сьвету. Імпэрыялістычны сьвет не чакаў, каб нашы прапановы былі нагэтулькі простыя і канкрэтны па зьместу.

Формула францускіх імпэрыялістаў гэткая: спачатку бязпаспасьць, а пасьля разброеньне. Гэты пункт погляду ўвайшоў на вопыце жэнеўскіх пратаколаў 1924 г. адносна «бязпаспасьці, трэцейскім разбору і разброеньні» пратаколаў, якія былі анулёраваны ангельскім кансэрватыўным урадам, прыхільным на месца Макдональда. Гэтай францускай формуле была супроцьпастаўлена ангельская, якая нахараніла ўсякія намаўкі аб жэнеўскіх пратаколах, бо высунула формулы аб неабходнасьці разброеньня без папярэдняга забясьпечаньня бязпаспасьці.

Стараны пасьля гэтага розныя камітэты і камісіі па разброеньню яшчэ глыбей пахавалі ўсю гэтую справу. Усе надзеі апошні год пакавалі, што імпэрыялістычныя дзяржавы разам з Лігай Нацый вядуць увесь сьвет не да пакою, а да вайны.

Савецкі ўрад прапануе адразу рашуча ўзяцца за ўсеагульнае разброеньне. Бяз усякіх агульных фраз, якія нікому нічога не гавораць. Мы прапануем дакладныя ўмовы ўсёй сыстэме разброеньня.

Мы ня сумняваемся ў тым, што капіталістычны сьвет у асобе свайго камітэту па разброеньню адхіліць усе нашы прапановы. Ён знойдзе ў сваіх арсэналах досыць маны і ашуканства для таго, каб праваліць справу разброеньня. Інакш і ня можа быць, бо капіталісты ўсяго сьвету ўзмоцнена зараз рыхтуюцца да вайны.

Вось чаму мы хочам яшчэ раз падкрэсьліць, што па сутнасьці нашы прапановы аб разброеньні накіраваны ў першую чаргу да працоўных мас усяго сьвету. Толькі на іх падтрыманьне мы разьлічваем, толькі яны сапраўды могуць перашкодзіць узьнікненьню новых войн.

Лёкаут 800000.

Саюз мэталёпрамыслоўцаў Нямеччыны абвясьціў лёкаут на 22 лютага. Адміністрацыя дзесяткаў заводаў ужо паведаміла сваіх рабочых аб тым, што яны з серады зволены. Абвешчана аб спыненьні працы на заводах Сымэнса, дзе працуе звыш 100 тысяч рабочых. У адным Бэрліне будзе звольнена каля 250 тысяч чалавек.

Мэталёпрамыслоўцы і наогул усе капіталісты Нямеччыны хочуць зараз даць рабочай клясе генэральны бой. Капіталісты добра ведаюць сваіх агентаў—кіраўнікоў прафэсыянальных саюзаў. Безумоўна, гэтыя кіраўнікі ня пойдуць на разгортваньне масавага руху, на спыненьне ўсяго гаспадарчага жыцьця дзяржавы—вугаль, чыгункі, электрычнай станцыі. Мэталёпрамыслоўцы рашылі панесьці вялікія страты на спыненьні вытворчасьці, але затое нанесьці рабочым цяжкае паражэньне. У сакавіку і красавіку калі 5-6 мілёнаў рабочых перазаключаюць калектыўныя дагаворы, рэфармісты будуць досыць мяккімі і ня пойдуць на актыўнае падтрыманьне сваіх зволеных братоў.

Але ўсе гэтыя разважаньні капіталістаў могуць быць і апракінуты. Камуністычная газэта «Ротэ Фанэ» што дзень друкуе рэзалюцыі рабочых фабрык і заводаў аб тым, каб распачаць масавую барацьбу. Некаторыя заводы ўжо далучыліся да барацьбы, адмовіўшыся ад звыштэрміновай працы, высунулі свае ўласнае патрабаваньне і гэтак д.

Абурэньне рабочых асабліва вялікае ў Бэрліне, бо галоўная частка рабочых, якія падпалі пад лёкаут, у ім і жывуць.

Бэрлін асабліва абураны яшчэ і таму, што ў ім знаходзіцца цэнтр электратэхнічнай прамысловасьці, якая ў апошнія гады зрабіла вельмі добрыя справы. Капіталісты ня хочуць падзяліцца з пралетарыятам ні на адзін пфэніг з сваіх багатых заработкаў. Гэта яшчэ больш абурае рабочую клясу і ў першую чаргу бэрлінскі пралетарыят.

Нямеччына зараз уваходзіць у паласу вострай клясавай барацьбы. У гэтую барацьбу будуць уцягнуты мілёны пралетарыяў, якія змагаюцца за мінімальную заработную плату, за больш-менш людзкае забясьпечаньне.

2-гі ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

21-га лютага разыграна 9.550 выйгрышаў па 100 руб. кожны, якія палі ўсе 50 нумароў аблігацый наступных сэрый пазыкі:

001.339	002.510		006 082	156.196	156.526	159.557	159.590
007.788	008.532	009.749	011.770	і 027.222			
017.669	018.031	018.981	019.568				
022.415	023.106	024.899	025.740				
026.955	027.443	029.220	030.560	000.445	000.870	002.563	008.401
030.645	031.926	035.868	036.448	009.776	014 640	015.639	016.639
036.778	037.571	037.589	038.828	020.577	022.068	022.111	023.112
040.875	041.588	042.385	042.421	026 660	032.135	032.871	036'674
044.241	045.517	045.868	049.220	037.439	047.493	047.709	048.460
049.721	049.751	050.461	050.892	050.574	050.893	056.455	056.964
053.539	054.032	054.997	055.731	059.790	061.008	061.427	062.174
060.365	060.961	061.316	063.502	065.176	070.980	081.367	082.024
063.846	064.347	064.426	065.675	082.630	083 168	085.047	091.321
066.482	066.977	073.315	074.546	091.628	101.562	102.721	106.223
074.953	075.366	076.222	078.980	106.721	112.093	112.190	113.520
079.372	081.000	081.715	081.885	120.080	124.878	132.349	134.462
083.522	084.988	087 943	089.344	137.620	139.075	140.451	149.414
089.682	089.860	090.507	091.167	150.898	152.831	157.951	158.032
093.006	094.177	094.567	094.840	158.732	158.803	159.814	
095.732	096.821	096.892	096.947				
099.462	099.666	102.486	105.073				
106.149	106.201	106.692	106.973				
109.049	111.374	111.621	112.440				
115.710	118.765	119.344	124.533				
126.860	128.144	133.322	134 038				
135 134	135.197	136.004	136.172				
136.349	137.496	137.539	138.098				
139.039	140.293	144.045	144.053				
144.149	144.672	147.590	148.200				
148.851	149.526	150.121	150.487

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ—ПАД АБСАЦАМ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ.

65 процантаў дарослага насельніцтва Зах. Беларусі сядзелі ў польскіх турмах за тое, што хацелі зямлі, хлеба і працы.

Насельніцтва Польшчы па падліку 1921 і 1924 г. г. складае 28.500.000 чал., з іх звыш 40 проц. належыць да нацыменшасьцяў: 6.000.000 украінцаў, 2.500.000 беларусаў, 3.000.000 яўрэяў, 1.500.000 немцаў, каля 120.000 літоўцаў.

Тэрыторыя—170.032 кв. кіл. з пераважна польскім насельніцтвам. 218.296 кв. клм. з перавагаю нацменшасьці. Заходняя Беларусь займае 79.467 кв. кіл., г. зн. 22 проц. усёй тэрыторыі.

Заходняй Беларусьсю лічыцца Віленскае, Навагрудзкае, Палескае і Беластоцкае ваяводзтвы.

У Зах. Беларусі 82-90 проц. сялянства. Процант сялянскіх гаспадарак ніжэй 5 гектараў—61,4 проц.

Польскія абшарнікі ў Зах. Беларусі валодаюць 4.041.507 гэктара, 42,66 проц. зямлі, годнай для апрацоўкі.

У часе сусьветнай вайны на тэрыторыі Зах. Беларус. было зруйнавана 600.000 сялянскіх гаспадарак.

Польскія імпэрыялісты адбіраюць зямлю ў беларускіх сялян, аддаюць іх польскім ваенным перасяленцам, якія ніколі нічога агульнага з зямлёю не мелі. Дзякуючы гэтай сыстэме ваеннай калёнізацыі, якая завецца «асадніцтвам», у Заходняй Беларусі і Украіне насаджаецца польская казацтва. Да гэтага часу звыш 1.000.000 гэктараў беларускіх і ўкраінскіх зямель перададзена ваенным калёністам. З гэтых зямель па 200 гэктараў і больш атрымалі польскія генэралы, у тым ліку маршал Пілсудзкі.

Усе натуральныя багацьці (лясы, Белавежская пушча) драпежным спосабам распрадаюцца чужаземнаму капіталу.

Байкот мясцоваму насельніцтву. Мясцовае беларускае насельніцтва не дапушчаецца польскаю ўладаю ні ў якія грамадзкія і дзяржаўныя установы і выкідаецца з фабрык.

Падатковая кампанія. У Беларусі і Украіне высякаецца ў тры разы больш падаткаў, чым у карэннай Польшчы. Гэтыя непасільныя падаткі высякаюцца карнымі атрадамі і пры гэтым канфіскуецца і прадаецца сялянская маемасьць.

Прасьледваньне нацыянальнай культуры. «Няма украінцаў, беларусаў і літоўцаў—ёсьць толькі палякі» —вось лёзунг польскага імпэрыялізму. За 8 год панаваньня палякаў у Заходняй Украіне зачынена 2100 украінскіх школ і ў Беларусі ўсе 514 школ, якія там існавалі. Беларусы прымушаны вучыцца ў польскіх школах.

Паліцэйскі апарат у Беларусі і Украіне ўсё расьце. Ужо в 1923 году на афіцыйных даных на тэрыторыі Украіны і Беларусі налічваецца 20.000 паліцэйскіх, апроч шматлікіх агентаў хранкі.

Беларуская мова відзе ў Беларусі польскаю ўладаю не прызнаецца, яна прабілася «нелегальнаю» моваю.

Гэты нячуваны ўціск выклікаў абурэньне сярод сялянства. Польскі ўрад, каб прыдушыць гэты рух, справакаваў партыйанскія выступленьні галодных сялян (у 1924-25 г. г.), якія былі затоплены ў крыві.

Усе гэтыя ўмовы тэрору і ўціску выклікалі ярод усяго працоўнага насельніцтва Беларусі імкненьне да стварэньня ўласнай арганізацыі для абароны сваіх інтарэсаў.

У 1925 годзе ў Беларусі ўзьнікла рабоча-сялянская арганізацыя — Грамада—на чале якой стаялі беларускія дэпутаты Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла, якія адпаніліся ад нацыянальнага Беларускага Клюбу.

Грамада паставіла сабе мэтай барацьбу за штодзённыя патрэбы беларусаў, супроць нацыянальнага ўціску, за вызваленьне беларускага народу, за зямлю бяз выкупу, за супольную барацьбу працоўных Беларусі і ўсёй Польшчы.

Грамада шпарка расьце, працоўныя масы Беларусі ўгледжваюць у Грамадзе арганізацыю, якая сапраўды змагаецца за іх інтарэсы. Налічваючы ў пачатку 1926 г. усяго 4000 членаў, Грамада яднае ў сьнежні 50.000 чал., а ў момант разгрому яе ў студзені 1927 г. 100.000 членаў і 1720 ячэек у 27 паветах з беларускім насельніцтвам.

Гэты рост Грамады непакоіць фашысцкі ўрад і польскіх абшарнікаў, якія бачаць у ёй рэальную сілу, якая можа весьці барацьбу, супроць польскага імпэрыялізму, супроць эксплёатацыі і ўціску мас.

Пачынаецца паласа абвостранага белага тэрору.

Толькі за 1926 г. у Польшчы было 514 працэсаў, па якіх судзілася 3903 рабочых і сялян і вынесена прыгавораў да 7369 гадоў катаргі. У пачатку 1927 году ва Уладзіміры-Валынскім (Украіна) 118 сялян былі засуджаны на 1000 год катаргі.

Гэты бязьлітасны тэрор не напалохаў мас, яны яшчэ мацней згрупаваліся вакол сваёй арганізацыі. Пілсудзкі, задумаўшы вайну супроць СССР і рыхтуючыся да яе, згаварыўся з польскімі абшарнікамі, якія мараць адабраць зямлю ў беларусаў і украінцаў, знаходзячыхся ў СССР. Яны рашылі зьнішчыць Грамаду, каб забясьпечыць сабе тыл у выпадку вайны.

Ахранка пачынае падрыхтоўваць правакацыйныя працэсы і не адзін раз правакуе сялянства. Польская буржуазея і яе прэса вядуць шалёнае цкаваньне супроць Грамады.

Урад, дазволіўшы Грамадзе легальную канфэрэнцыю ў Стара-Бярозаве (Зах. Беларусь), тут жа пастанавіла разагнаць гэтую канфэрэнцыю. Для гэтай мэты быў пасланы атрад у 300 паліцэйскіх з кулямётамі. Удзельнікі канфэрэнцыі былі зьбіты саблямі, паранена было звыш 100 сялян, у тым ліку дэпутаты Грамады—Мятла і Валошын.

16-га студзеня 1927 г. пачынаецца агульны **разгром усяго беларускага нацыянальнага руху.** Арыштоўваюцца ўсе 4 дэпутаты Грамады (яшчэ да зьняцьця з іх парлямянцкага імунітэту) і дэпутат незалежнай сялянскай партыі Галавач, члены ЦК і мясцовых камітэтаў Грамады, члены таварыства «Беларускай школы», дырэктары і настаўнікі ўсіх беларускіх прыватных гімназій, цэнтральнае праўленьне мясцовага і беларускага банкаў. Банкі былі зачынены і грошы канфіскаваны. Толькі за тры дні было арыштавана больш 600 чал., арыштаваных б'юць і катуюць у ахранцы. Так, напрыклад, быў люта скатаваны, а потым павешаны ў турме рабочы Адольф Райхман, аб якім афіцыйна было паведамлена, што ён нібы «скончыў жыцьцё самагубствам».

Патрабаваньне аб пазбаўленьні дэпутатаў імунітэту было складзена так пынічна і бязгрунтоўна, што нават пэпэсавец Лібэрман быў прымушан абвесьціць в трыбуны сойму, што «ні ў актах, ні ў дакумантах няма ніводнага доваду, якія-б пацьвярджалі абвінавачаньне проці дэпутатаў Грамады». Дэпутат Сабалеўскі (беларус) пры гэтым адзначыў, што «65 проц. дарослага насельніцтва Зах. Беларусі ўжо сядзелі ў турмах за тое, што хацелі зямлі, хлеба і працы».

Гэтыя арышты выклікалі абурэньне сялянства Беларусі. Усюды адбываліся дэманстрацыі, мітынгі пратэсту. На гэтыя масавыя пратэсты Пілсудзкі адказаў новай крывавай расправай. 9-га лютага 1927 г. у м. Косаве (Зах. Беларусь) каля 1000 сялян паладзілі дэманстрацыю пратэсту, паліцыя пачала страляніну, забіта 5 і цяжка паранена 6 сялян, ня лічачы некалькі дзесяткаў лёгка параненых.

У канцы лютага 1927 г. паліцыя ў г. Слоніме (Зах. Белар.) страляла ў гэткую-ж дэманстрацыю сялян, цяжка параніўшы 12 чал.

Пілсудзкі стараецца **канчаткова зьнішчыць Грамаду.** Карныя экспэдыцыі, правакатары і ахранькі лазяць усюды, зьбіваюць і арыштоўваюць сялян. З другога боку, Пілсудзкі стараецца пры дапамозе правакацыі і подкупу прыцягнуць на свой бок усіх здраднікаў беларускага народу і пры іх дапамозе перацягнуць масы на свой бок. Але гэта яму не ўдаецца, масы ня ідуць на агітацыю апартуністаў і прадажных нягодзікаў.

Апошнія выбары ў органы мясцовага самакіраўніцтва (46 месяцаў таму назад) яскрава выявілі настрой беларускага сялянства. 80 проц. усіх абраных кандыдатаў зьяўляюцца прыхільнікамі Грамады і яе лёзунгаў.

Каб канчаткова разграміць рэвалюцыйны рух і тэрарызаваць насельніцтва Беларусі, Пілсудзкі арганізуе цяпер **суд над 400 лепшымі сынамі беларускага народу.** Каб апраўдаць загадзя вырашаныя катаржныя прысуды, польская пракуратура грунтуе ўсё абвінавачаньне на яўна-правакацыйным сьцьвярджэньні, што Грамада, нібы, дзейнічала ў інтарэсах «чужаземнай дзяржавы» і што дзеячы яе зьяўляюцца «агентамі Масквы». Разам з тым, баючыся, каб вялізарны працэс «400» не нарабіў надзвычайнага шуму ў Польшчы і замежамі, польскі ўрад пастанавіў разьбіць яго на 4 асобныя працэсы Грамады, якія будуць заслуханы ў розных ваяводзтвах.

Суд над Грамадой—гэта нячуваная правакацыя нават у гісторыі польскага белага тэрору, гэта **суд над усім беларускім народам.**

Працоўныя ўсяго сьвету з неаслабнай увагай будуць сачыць за гэтай судовай расправай. Неабходна мабілізаваць шырокія масы вакол гэтага агіднейшага гвалту над прыгнечанымі нацменшасьцямі Польшчы і ўзьняць голас пратэсту і абуроньня працоўных усіх краін. Трэба вырваць ахвяры польскага фашызму з рук катаў.

Хто каго павінен судзіць?

(Да працэсу „Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады *).

А вось апісаньне таго, як польская паліцыя ў З. Беларусі распраўляецца з цэлымі вёскамі, абвінавачваючы іх жыхароў у камунізьме (Інтэрпэляцыя ад 21 VII 1926 г.).

„Ад 30-У да 9-VI г. году ў вёсках Пацавічы, Малькавічы, Асаўміны, Боркі, Самылавічы, Ліхнічы, Зальвяне, Калядзічы і інш. вёсках Пескаўскай гм., Ваўкавыскага пав., адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод беларускіх сялян. Вобыскі ня далі ніякіх рэзультатаў, і ня гледзячы на гэта, арыштавалі 75 асоб, абвінавачваючы іх у камунізьме.

На гэтую оргію прыехала палая армія паліцыі і дэфэнзывы у мундзірах. І вось распачалі катаваньні і зьдзекі над невінаватымі і безбаронымі людзьмі. Сярод гэтых катаў асабліва вызначыўся п. Абручоў. Ён і яго калегі каты білі людзей да ўтраты прытомнасьці, пасьля адлівалі іх вадой, і тады, зьвязаўшы ім рукі і ногі і працягнуўшы паміж локцяй і каленаў шаблю, улівалі ім у нос мешаніну наступнага складу: вада, воцтавы квас, соль і камфорны сьпіртус. Потым прымушалі, каб ахвяры гэтыя прызнаваліся да таго, чаго жадалі каты, а хто не прызнаваўся—ізноў гэтак сама білі".

А вось яскравы малюнак зьвярынай расправы і разам цынізму польскай адміністрацыі і паліцыі: паліцыя іграе на бандуры і пяе, каб гэтым заглушыць крыкі і стогны катаваных; катаваньне адбываецца пад кіраўніцтвам камэнданта паліцыі; сьледчы судзьдзя сьвярджае, што «біцьцё і катаваньне—гэта адзіны спосаб пры допыце і што тут няма ніякай канстытуцыі».

„Учачы з 27 на 28 красавіка г. г. на абшары Кобрынскага пав. былі зроблены масавыя арышты сярод беларускага і яўрэйскага насельніцтва. У гэты час былі арыштаваны 41 чал.

Так званы допыт паліцыя рабіла ўначы, дзеля чаго брала на аднаму з арыштаваных і адводзіла ў асобную камору. Там, зьвязаўшы разам рукі і ногі катаванаму, працягнуўшы паміж імі кій, паліцыянты білі свае ахвяры кіямі ў паты, таўкі нагамі ў бакі, вырывалі з галавы валасы, улівалі ў нос горка-салёную ваду і нагулі рабілі г. зв. допыт такім самым спосабам, які практыкуецца цяпер у Польшчы і перад якім блядняюць усе спосабы зьдзеку і катаваньняў людзей, якія толькі бачыў сьвет.

Усяго гэтага для кобрынскай паліцыі было мала, таму закавалі ахварам рукі і тапталі іх і білі нагамі; вырадкі-паліцыянты плявалі катаваным у твар.

У часе гэтага допыту, каб затаўшыць крыкі і стогі, паніздалі ахварам на гасцры кажухі і затыкалі ім рот анучамі, і, апрача таго, тыя з паліцыянтаў, якія мелі здольнасьць да музыкі, іграці на бандуры і пялі.

Наваколі паліцэйскага пастарунку стаяць паліцыя, якая нікога ня ўпускала, і калі выпадкова ўпайшоў туды Сроз Камянецкі (Кобрынь, Берасьцейская, 15), 70-гадовы дзед, то паліцыя схапіла яго і адразу пачала біць, крычачы: „жыдзе, камуністе!" і г. д.

Некалькі разоў прыходзіў на пастарунак сьледчы судзьдзя даведацца, «ці не надумаліся арыштаваныя" і, не атрымаўшы адказу, пацяшаў: „я вас паніну яшчэ тут і тады вы напэўна ўсё скажаце".

Некаторыя з арыштаваных скардзіліся сьледчаму судзьдзю на побіцьцё і катаваньні паліцыянтамі, на што ён адказвае, што гэта «адзіны спосаб пры допыце і што тут няма ніякае канстытуцыі». Шкіі з насьмешкамі павсьнялі арыштаваным, што яны на незначны час аддадзены на «ласку» паліцэйскай улады. Усе гэтыя дзікасьці і катаваньні людзей паліцыя выконвала пад кіраўніцтвам камэнданта сьледчай паліцыі Ягадзінскага, шпіка Адамчыка і Солтана, выканаўцамі-ж гэтага дзікага катаваньня былі 12 паліцыянтаў".

Здаецца, што далей у дзікасьці і цынізьме ўжо няма куды ісьці, аднак, ніжэйапісаны факт пераконвае нас, што польская паліцыя ў Зах. Беларусі проста геніяльна ў выдумваньні ўсё новых спосабаў катаваньняў, якія пасуюць толькі людзям-зьверам, страціўшым усякае надабенства з чалавечым абліччам. Вось прачытайце асабліва ўважліва інтэрпэляцыю ад 30 X 1926 г:

„20 верасьня 1925 году дзяржаўная паліцыя ў Слоніме, па абвінавачаньню ў правядзеньні камуністычнай акцыі, арыштавала Навасейю Кандрата, жыхара вёскі Савічы, Шыдавіцкай гм.

Таго-ж самага дня яго адвялі ў экспэртызу палітычнай паліцыі ў Слоніме, дзе і пачаўся допыт, здучаны з бязьлітасным біцьцём. Выканаўцамі гэтай экзэкуцыі былі два п'яныя выведнікі. Пасьля звычайнага біцьця рэвальвэрамі, пашлі спэцыяльныя спосабы: ахвяру падвесілі на моцна завязаных назад руках і білі па твары да ўтраты прытомнасьці, а калі ахвяра прыходзіла ў прытомнасьць, зьдзекі йшлі далей. Здымалі вопратку і валаклі па зямлі; паміж пальцамі ўкладалі алоўкі і ламалі пальцы; рашчынялі жалезам рот і ўлівалі ваду; паміж пальцамі закладалі і падпальвалі анучкі і паперу, абмочаную ў нафце; калолі іголкай цела, змушалі хрысьціцца перад Гольскім гэрбам, ПРЫВЯЗВАЛІ ШНУРКОМ ЗА ПЛОЦЬНЫЯ ОРГАНЫ І ЦЯГНУЛІ ЎГАРУ, а калі ахвяра пачынала крычаць, адзін з выведнікаў наступаў на горла і душыў у г. д.".

У большасьці выпадкаў катаваньні канчаюцца больш-менш цяжкімі калецтвамі, ад якіх пацярпеўшыя мучаюцца праз усё жыцьцё, але бываюць і такія выпадкі, што скатаваныя ня вытрымліваюць мучэньняў і паміраюць. Прыводзім тут два такія выпадкі, апісаныя ў інтэрпэляцыях ад 30-X 1926 г.

„У верасьні 1926 году Чуйко Самуіл, які пражывае ў вёсцы Малая Пач, Сьвята-Вольскай гміны, Косаўскага павету, варочаючыся да дому з штодзённай працы па нагрузцы вагонаў на вузка калейнай чыгунцы, узяў на цьвінтары кавалак апалавага дрэва. Гэты выбражальны крадзеж заўважыла паліцыя, паклікала яго на пастарунак і пачала паказваць сваю „справядлівасьць". Загаляўшы перш за ўсё скінуць вопратку, зьдзекавалася над ім, потым пры дапамозе дошкі, спосабам ім ужо вядомым, пачала катаваньне, б'ючы паважна ў паты ног. А для таго, каб ня было крыку і, праўдападобна, каб гэтага крыку ня было чутна з вуліцы, праз увесь час катаваньня затыкалі яму рот. Здаволіўшы свае інстынкты, яго поўжывога выпхнулі на двор. Такіх фізычных і маральных цярпеньняў Чуйко ня мог вытрымаць і, вярнуўшыся дадому, зварацеў.

Жонка Чуйкі—Хвядора Чуйка, жадаючы даць лекарскую дапамогу, паехала з мужам да бліжэйшага лекара ў Толеханах, але гэты апошні з прычыны цяжкага стану Чуйкі адмовіўся дапамагчы. Дзеля гэтага яна мусіла паехаць у Пінск у шпіталь, дзе ў хуткім часе Чуйка і памёр, пакінуўшы пасьля сябе незабясьпечаную ўдаву з трыма дзяцьмі".

А вось другі выпадак:

„На Дзяніканскай вул. а 6 гадзіне ўвечары быў арыштаваны Карнаус Ян, жыхар Горадні, і адпраўлены ў і камісарыят дзяржаўнай паліцыі. На другі дзень жонка, жадаючы наведацца да мужа, найшла ў вышэйпамянёны камісарыят.

Дзяжурны паліцыянт пасьля доўгіх адмоў, што нібы-та такога Карнаўса ў камісарыяце ня было, нарэшце сказаў, што галаву яму завёз Карнаус павесіўся, а труп яго адвезьлі ў мясцовы шпіталь. Атрымаўшы такую вестку, заклапочаная кабета разам з сваім знаёмым Уско Арсенам, які пражывае на Тэатральнай вул., пад № 11, зараз-жа накіравалася ў шпіталь, дзе ў трупярні і знайшла труп свайго мужа. Аднак, нічых сьлядоў ад павешаньня ня было; заўважыла толькі сінак на левым віску.

Факт гэты сьведчыць, што сьмерць Карнауса ў і камісарыяце была выклікана іншай прычынай".

Мы прывялі тут толькі некаторыя з шматлікіх фактаў катаваньняў і забойстваў, зафіксаваных у інтэрпэляцыях паслоў з «Бел. Сялянска-Рабочай Грамады». Трэба пры гэтым зазначыць, што далёка ня ўсе факты крымінальных праступкаў польскай паліцыі і паогул адміністрацыі ў З. Беларусі паданы да [illegible] гэта ведама ў інтэрпэляцыях. Можна сьмела сказаць, што зафіксаваны ў інтэрпэляцыях факты складаюць мо[illegible] адну дзесятую частку агульнага ліку крывавых распраў над насьленьнем З. Беларусі, бо шмат такіх фактаў не дайшло да паслоў. І яшчэ адно трэба сьцьвердзіць, што амаль ніводная інтэрпэляцыя не дасягнула сваёй мэты, г. ё. аб'ектыўнага расьсьледваньня факту катаваньня ці забойства. Звычайны шлях, на якім накіроўваюцца закранутыя ў інтэрпэляцыі справы, такі: маршалак сойму накіроўвае справу адпаведнаму міністру, міністар—начальніку той установы, дзе меў месца апісаны ў інтэрпэляцыі факт. Зразумела, што гэтая ўстанова робіць усё ад яе залежнае, каб факт перакруціць і прадставіць у вусім іншым, як у інтэрпэляцыі, выглядзе.

Трэба таксама сканстатаваць, што ніводная крымінальная справа, па якой была падана беларускімі паслами інтэрпэляцыя, ня была як сьлед выкрыта, а вінаватыя пакараны.

З усяго гэтага і адміністрацыя і насьленьне Зах. Беларусі робяць адпаведныя вывады: адміністрацыя,—што катаваць ня толькі можна, а і трэба, а насьленьне—што польская адміністрацыя ненавідзіць беларускі народ і толькі і ведае, што катаваць і зьдзекавацца над ім. У адказ на агульна-народны пратэст проці гэтых зьдзекаў і катаваньняў, проці поўнага бяспраўя і нежаданьня прызнаць за беларускім народам у Польшчы хоць бы самыя элемэнтарныя правы, сучасны польскі ўрад абрушваецца яшчэ нявіданымі рэпрэсіямі проці агульна-народнай беларускай арганізацыі «Бел. С.-Р Грамады» і гэтым хоча задушыць беларускі вызваленчы рух. Лепшыя сыны Зах. Беларусі ўкінуты ў вастрогі і там пакутуюць ужо больш году, чакаючы над сабою судовай расправы за тое, што паднялі свой голас пратэсту проці бязупынных зьдзекаў.

Тыя, хто катуе народ, хто ўкрывае пазор сваіх дзікіх распраў над безабароннымі народам ад людзкога вока, хто арыштоўвае найлепшых людзей Зах. Беларусі за іх самаахвярную барацьбу за правы народу,—той будзе цяпер судзіць і казаць.

Гэта гучыць нейкай гіроніяй над агульна-людзкай справядлівасьцю і гэта ў сваім часе пакінна памсьціцца на катах і моцна пасьміяцца.

Замежнік.

*) Канец. Пачатак гл. „Сав. Бел." № 46.

Дзесятая гадавіна незалежнасьці Літвы.

ІНЦЫДЭНТ НА ЎРАЧЫСТАСЬЦЯХ 10-АЙ ГАДАВІНЫ.

Польскія газэты паведамляюць, што на ўрачыстым спэктаклі з прычыны 10-х угодкаў незалежнасьці Літвы ў прысутнасьці Сьмятоны і Вальдэмараса, здарыўся наступны інцыдэнт. Прамоўцы дэмакратычных партый Вілейнікс, адв. Леонас і хрысьціянскі дэм. Вічунас выказалися за скліканьне сойму і ўстанаўленьне канстытуцыйнага ладу. Сьмятона і Вальдэмарас дэманстрацыйна пакінулі тэатр у часе гэтых прамоў. Афіцэры, якія знаходзіліся ў тэатры, атрымалі загад пакінуць залю.

ДЭКРЭТ АБ АМНІСТЫІ.

У сувязі з 10-цігодзьдзем незалежнасьці Літвы прэзыдэнт Сьмятона выдаў дэкрэт аб амністыі. Агульная лічба амністыраваных раўняецца прыблізна 1000 асобам, з якіх 300 прыпадае на Клайпеду.

* * *

Польскія газэты паведамляюць, што літоўскі ўрад да апошняй пары не абмяркоўвае яшчэ дэкрэту аб амністыі. Выпушчана на волю толькі некалькі асоб з канцэнтраційнага лягеру ў Ворнях і некалькім эмігрантам дазволена вярнуцца ў Літву.

«НЯМА ЛІТВЫ БЯЗ ВІЛЬНІ».

Урачыстасьці з прычыны 10-й гадавіны незалежнасьці Літвы мелі спакойны характар. На асьветленых вуліцах праходзілися вечарам маніфэстацыі, пры гэтым вілася антыпольская агітацыя. На сьцягах былі надпісы: „Няма Літвы бяз Вільні", „Нехай жыве Літва з Клайпэдай і Вільняй".

ОРДЭН ГЕДЫМІНА ДЛЯ СЬМЯТОНЫ І ВАЛЬДЭМАРАСА.

У дзень 10-ай гадавіны незалежнасьці Літвы Сьмятона і Вальдэмарас былі нагароджаны ордэнам Гедыміна.

СЬВЯТКАВАНЬНЕ 10-ГАДАВІНЫ Ў ВІЛЬНІ.

Віленскія ліцьвіны сьвяткавалі 10-ую гадавіну незалежнасьці Літвы 15 лютага г. г. З прамовамі выступілі кс. Краўялис, д-р Выгодзкі (ад яўрэяў), Сукеніцкі (ад палякаў) і прадстаўнікі беларусаў.

ЛІТОЎСКІ СЬЦЯГ НА ЗАМКАВАЙ ГАРЫ.

Учачы з 15 на 16 лютага г. г. нявыкрытыя асобы павесілі на вежы Замкавай гары літоўскі сьцяг з „пагоняй", нерадзіны жалобным крэпам. „Да. Віл." прыпушчае, што сьцяг вывешан ліцьвінамі, якія гэтым спосабам хацелі зманіфэставаць 10ую гадавіну незалежнасьці Літвы.

Тэрарыстычная арганізацыя ў Літве.

З Рыгі паведамляюць, што літоўскі ўрад выкрыў вялікую тэрарыстычную арганізацыю, якая мела свае катаў змаганьне з урадам Вальдэмараса і. Выкрыцьцё арганізацыі наступіла пасьля таго, як было злоўлена пісьмо літоўскім эм грантам, з якога вынікае, што цэнтр арганізацыі ў Вільні.

У АПОШНІ ЧАС

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

РАБОЧАЯ КЛЯСА НЯМЕЧЧЫНЫ НЯ СПЫНІЦЬ БАРАЦЬБЫ.

БЭРЛІН, 22-II. «Ротэ Фанэ» піша: «Кіраўнікі агульна-нямецкага саюзу мэталёўцмў так сьпяшаліся прыдумыць барацьбу, што не забясьпечылі нават неабходных гарантый супроць рэпрэсій у адносінах к удзельнікам забастоўкі.

Кампартыя і перадавая частка рабочых мас у Сярэдняй Нямеччыне працягнуць барацьбу да астатняга моманту. Апарат трацейскага разьбірацельства можа быць разьбіты, і права стачак можа быць забясьпечана не пры дапамозе выбарчых бюлетэняў на выбарах у рэйхстаг, а шляхам „незаконнай" барацьбы супроць абвяшчэньня трацейскіх пастаноў абавязковымі".

ІТАЛЬЯНСКАЯ ЗАБАСТОЎКА НА ШТЭЦІНСКІХ ВЭРФЯХ.

БЭРЛІН, 22-11. Дэлегацкі сход рабочых Штэціпскіх вэрфяў прапануе ўсім рабочым пакідаць прадпрыёмствы пасьля 8-мі гадзін працы.

Маленькі фэльетон.

УСЁ СПАКОЙНА...

Усё спакойна.
Год усёроўна мае 365 дзён.
Высакосны 366.
Зямля ўсёроўна круціцца...
І нашыя беларускія паштавікі ўсёроўна ня ведаюць ні беларускай мовы, ні тых моваў, якія па канстытуцыі яны павінны ведаць.

Дзесяць разоў з часу Кастрычнікавай рэвалюцыі зямля, па чутках, перакруцілася вакол сонца, а нашыя паштавікі ўсё яшчэ не пасьпелі і некалькі крокаў зрабіць у напрамку выкананьня нашай нацыянальнай палітыкі.

Адным словам круціліся з зямлёю,—часу ня было.

Я ўжо пісаў некалі пра нашую пошту і ўжо, праўду кажучы, думаў, што праклятая спадчына вялікадзяржаўнага шавінізму на пошту больш ня вернецца.

Вярнулася,—трасца ёй!..

А было гэтак.

Атрымалі на пошце гэтымі днямі паперку. Напісана яна была паляўрэйску.

— Вы, бачыці, зноў пейкі ляўрэйска піша, заўважыў адзін з пештавікоў. І паляўрэйску дадаў ён зьбялеўшымі вуснамі, разглядзеўшы паперку. Давялі!..

Пасьля невялічкай нарады в іншымі паштавікамі ліст быў зьвернут адрасату з наступным надпісам:

«Возвращается редакции газеты „Дэр Эмэс" для перевода на русский язык. г. Минск».

Словам, зьвярнулі ліст і...

...Зноў усё спакойна.

Год зноў мае 365 дзён.

Высакосны 366.

І «кожны раз на эфтым самым месцы», як кажа прыказка.

Кончу фэльетон гэтак:

На пошце была адна чыстка. Дыдвось, я-б яшчэ адну зрабіў...

І было-б гэта, як той казаў, хаця-ж і ня ў рыфму, дык затое здорава.

Алёша.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

К-ты сял. узаемадапамогі будуюць цягельні.

Да гэтага часу к-ты сялянскай узаемадапамогі пабудавалі на абшарах БССР каля 80 цагельняў, якія выпусьцілі за мінулы год да 3-х мілёнаў штук цаглін.

Некаторыя цагельныя заводы, як у Расонскім р., Полацкай акр. і ў Каралінскім р., Мазырскай акругі, зьяўляюцца буйнымі прамысловымі, добраабсталяванымі прадпрыёмствамі, якія выпускаюць у год звыш 200 тысяч штук цэглы.

У бліжэйшыя 5 год ЦК камітэтаў сялянскай узаемадапамогі мяркуе пабудаваць да 300 цагельняў, прымаючы ў гэтым пад увагу вялікі попыт на цэглу з боку сялянства.

ПЕРААБСТАЛЯВАНЬНЕ ЛЯСНЫХ ЗАВОДАЎ.

Гомель, 22-II. Лесбел пачаў пераабсталяваньне лясных заводаў Новабельцы. Лесапільны цэх лесазаводу № 2 пераведзены на лесазавод «Колтруд», які працуе на 2 зьмены. Як толькі скончыцца на лесазаводзе «Колтруд» абсталяваньне, рабочыя бачарнага цэху будуць такеама пераведзены на адзначаны завод. Корпус ранейшага лезазаводу № 2 думаюць скарыстаць пад мэблявую фабрыку.

БАРАЦБА З БЕСПРАЦОЎЕМ.

Гомель, 23-2. Беспрацоўе ў акрузе павялічваецца. У параўнаньні з мінулым месяцам колькасьць беспрацоўных у акрузе павялічылася на 428 чал. На 1-е лютага на біржы працы зарэгістравана 7457 беспрацоўных, з якіх членаў саюзаў—5252 ч.

Біржа працы ў сучасны момант робіць усе належныя захады да поўнай ліквідацыі беспрацоўя сярод начальніцкага запасу, якіх зарэгістравана на біржы каля 25 чал. Гэты кантынгент беспрацоўных—галоўным чынам начскай рапейшых дэмабілізацый,—і складаўся з асоб зволеных з грамадзянскіх устаноў у апошнія гады.

Зроблена вялікая праца ў адносінах пасылкі на працу дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. З 711 беспрацоўных—256 пасланы на сталыя пасады, 370 чал. пасылаліся на часовую працу. На 22 лютага засталося на вучоце біржы 116 чалавек, з якіх толькі 35 чал. пражываюць у Гомелі, а астатнія ў насёлках акругі. Гэтыя таварышы ў хуткім часе будуць пасланы на працу.

ЗА НЯДБАЙНАСЬЦЬ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

Гарадзец, 20-II. Аддадзен пад суд старшыня Маскалеўшчынскага с.-с. Гарадзецкага раёну—Є. Машноў за нядбайныя адносіны да правядзеньня спагнаньня дзяржаўных падаткаў і страхоўкі.

Справа аб Машнове ў хуткім часе будзе слухацца ў Віцебскім акруговым судзе.

ВЫНІКІ ШКОЛЬНАГА ПЕРАПІСУ.

Ворша. У Аршанскай акрузе скончан школьны перапіс.

Па акрузе ўсяго працуе 1347 настаўнікаў, з іх працуе ў сямігодках—329 чал.

У 9 школах прафасьветы працуе 65 настаўнікаў.

Усяго зарэгістравана вучняў 58778 чалавек, з іх у гарадзкіх школах—8823.

Большасьць школ (622) утрымліваецца на раённых бюджэтах, 11 школ—на гарадзкім бюдж., 8 пачатковых школ—на сродках сялян, 10 школ—на бюджэце Народнага Каміcарыяту Шляхаў Зносін, 6 школ—на дзяржаўным бюджэце.

Беларускіх школ маецца—622, яўрэйскіх—23, расейскіх—4, літоўскіх—3, польскіх—5 і 2 зьмешаныя.

С.

ЗДАЧА ПАДАТКУ І СТРАХОЎКІ.

Гомель, 24-2. Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку ў апошнія дні па некаторых раёнах павялічылася. Хойніцкі раён напярэдадні 100 процантнага выкананьня заданьня па сельска-гаспадарчаму падатку. На 22 лютага падатку на раёну было здадзена 95 проц. З посьпехам праходзіць паступленьне ў Чачэрскім, Цярэхаўскім і Брагінскім раёнах. У гэтых раёнах к 1 сакавіка будзе ліквідавана запазычанасьць па сельска-гаспадарчаму падатку.

Страхавая запазычанасьць у Буда-Кашалёўскім раёне ліквідуецца слаба (55 проц.). У Гомелі і Рэчыцы ў бліжэйшыя дні будзе ў поўнай меры ліквідавана запазычанасьць. У сельскіх мясцовасьцях запазычанасьці засталося яшчэ 32 проц.

НОВЫ СКУРАНЫ ЗАВОД.

Гомель, 24-2. У хуткім часе мае быць пушчан саматужны гарбарны завод для пераапрацоўкі дробнай скуранай сыравіны. Гэты завод будзе знаходзіцца ў веданьні саматужнага прамысловага саюзу і будзе працаваць на арцельных пачатках. Кваліфікаваная рабочая сіла маецца.

ЗА 2-ЮЮ ДЭКАДУ ЛЮТАГА САБРАНА ПАЯВОЙ НЯДОІМКІ 10752 РУБ.

Полацк, 22-2. За час з 11 па 20 лютага па ўсёй сыстэме спажывецкай каапэрацыі сабрана паявой нядоімкі 10752 руб. За гэты-ж час каапэравана 865 сялянскіх гаспадарак.

ДА ПАБУДОВЫ НОВАГА КРАХМАЛЬНАГА ЗАВОДУ.

Гомель, 22-II. Інспэкцыя мясцовай прамысловасьці скончыла абсьледаваньне райёнаў для абсталяваньня крахмальна-патачнага заводу. Добрым месцам для пабудовы гэтага заводу зьяўляецца вёска Заспа, Рэчыцкага райёну. Вёска знаходзіцца ў цэнтры бульбянага райёну.

НА РЭЧЫЦКАЙ ФАБРЫЦЫ «ДНЕПР».

РЭЧЫЦА, 23-2. У Рэчыцы на новай сярніковай фабрыцы „Днепр" зараз робяць спробу аўтаматаў. На аўтамаце 1-2 чал. будуць выконваць працу, на якой было занята 10-15 чал. Часова пачаў працаваць рухавік у 75 сіл. Гэтымі днямі пачне працаваць машына. Магчыма, што фабрыка пачне працаваць да 15 сакавіка. З прычыны несваячасовага выкананьня заказаў сярніковага трэсту заводам «Пролетарый» фабрыка не распачынае працу. Урачыстае адчыненьне фабрыкі адбудзецца ў дні сьвяткаваньня 1 мая.

САБРАЛІ НЯДОІМКІ 22.206 РУБ.

Віцебск, 22-2. Кампанія па сыскаьню нядоімкі па паявых узносах у акрузе праходзе здавальняюча. Так, за другую дэкаду лютага спажывецкая каапэрацыя акругі сабрала нядоімкі 22.206 руб. Разам з тым ня спыняецца праца па ўцягваньню сялянства ў каапэрацыю,—за апошнія дзесяць дзён лютага каапэравана 982 сялянскія гаспадаркі.

РЫХТУЕМСЯ ДА СЯЎБЫ.

НАСЕНЬНЕ КАНЮШЫНЫ, ЦІМАФЕЕЎКІ І СЭРАДЭЛІ ЗАГАТОЎЛЕНА НА ЎСЕ 100 ПРОЦ.—ЗАГАТОЎКА ЛУБІНУ ЯШЧЭ НЕ РАЗГАРНУЛАСЯ.—СЁЛЕТА НА АБШАРАХ БССР БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ДА 155 ТРАКТАРАЎ.

Паводле вестак Цэнтраземскладу, да гэтага часу

Жыцьцё і праца асьветніка.

Бацькоўскія арганізацыі пры школах трэба аформіць.

У апошнія часы навакол школы пачынае ўтварацца грамадзкая думка. Гэта зьявішча можна толькі вітаць.

У РСФСР ужо заснаваліся і вядуць карысную працу дапамогі школе так званыя «Комитеты содействия школе», склад якіх увайшлі бацькі вучняў і ..., хто цікавіцца школай.

Комитеты содействия» маюць на ... запамогу школе матар'яльна, а ...гаюць бяднейшым вуч... ...ыцьці кніжак, адзе...

...лізацыю, пастаўленую на ...чт і кіруючуюся належным ...зумоўна, патрэбна падтры...

... гэтым напрамку не ад... ...на, на Беларусі гэтая ...ь некалькі іначай.

...можна падумаць, што ў нас ...сі няма зацікаўленасьці шко... ...ў гэтым напрамку нічога ...на і ня робіцца.

...ата ня так. За апошнія часы ... г. Менску досыць часта скліц... сходы бацькоў і робяць на іх ...раваздачы аб працы школы.

Гэтае зьявішча зьвязвае школу з ...сельніцтвам, знаёміць бацькоў з да... ...недахопамі школьнае ... і робіць школу са...

...йна добра, але ...цькоў, дзякуючы ...анізацыя да гэта... ...тавана належным ...высоўваюць запатра... ...і адміністрацыі, ня ...сьцямі і ўмовамі ...а таксама дазваля... ...брыкі, нясуразныя

...маслоўным, я заста... ...каторых запатрабаваньня... ...ых бацькамі да школы, ...инскай, 21. (Школа занад... ...агружана вучнямі, як ні адна ...адзкіх школаў: на 18 груп пры... ...ца звыш 930 вучняў).

...Гарговы бацькоўскі сход, канстату... ...ючы некаторыя дрэнныя санітарныя ...мовы ў жыцьці школы (у будынку ...рат школ, заняткі праводзяцца ў ...ы зьмены, і штодня школу прохо... ...ць каля 3000 вучняў), унёс наступ...

ныя запатрабаваньні: а) бак з вадою, пры якім цапер маюцца 2 конаўкі, замяніць фантанам, каб вучні абыходзіліся біз конавак, а ў прапіўным выпадку завесьці кожнаму вучню па конаўцы і ручніку; б) прапануецца адміністрацыі прыняць належныя крокі, каб пасьля кожнага наведваньня вучнямі ўборнай, тэхнічаўнік вымываў і выціраў ракавіну.

Зразумела, што ў ідэале ўсё гэта надзвычайна добра і карысна, але як гэта ажыцьцявіць сёньня і дзе знайсьці сродкі і мажлівасьці, вось аб гэтым ні слова.

Праўда, ёсьць і канкрэтная праца. Бацькоўскі сход выдзеліў бюро камісіі і з'арганізаваў шэраг сэкцый: гаспадарчую, санітарную, дапамогі бедным вучням і інш. Адным словам, сувязь паміж бацькамі і школай самая цесная, каб не некаторыя выпадкі, хоць і не страшныя, але і ня зусім прыемныя і здаровыя.

Бацькі пачынаюць весьці дзяжурствы ў школе. Дзяжурыць старшыня гаспадарчай камісіі грамадзянін Д-ы. На першай лекцыі, прысутнічаючы ў адным клясе, ён ставіць у «вугал» свайго сына «за шаласьць», на чацьвёртай лекцыі нагаварыў вучу няпрыемнага, выявіўшы сябе начальствам, нам. загадчыку школы і выказаў шараг пагроз, што разьбярэцца, дзе сьлед і г. д.

Тое, што бацькі цікавяцца школаю, складаюць грамадзкую думку наўкола яе,—гэта справа добрая, карысная і патрэбная. А вось, што гэтая думка і зацікаўленасьць ня маюць формы, гэта дрэнна, бо можа выклікаць шэраг непаразуменьняў, перашкаджаючых нармальнаму разьвіцьцю школы.

Ва ўзаемаадносінах паміж школай і бацькамі ворганам Наркамасьветы патрэбна ўнесьці яснасьць і вызначыць канкрэтныя формы і толькі тады грамадзкая думка будзе скарыстана як сьлед і абыйдзецца біз уродзтва.

Гатым пытаньнем належыць заняцца як мага хутчэй і стала вырашыць. Патрэбна скарыстаць вопыт існаваньня „Комитетов содействия школе" ў РСФСР, узяць усё карыснае дзеля нашых умоў і дадаць, чаго не хапае.

І. Масюкевіч.

Настаўніцтва сьпіць.

(Старыцкі сельсавет, Грэскага райёну).

...аспаўсюджваньні сялянскай 100-...ёвай пазыкі па Старыцкім сель...савеце прынялі ўдзел усе ўстановы і ...арганізацыі: с.-савет, хата-чытальня, ...ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМ. Адны толькі ...вашы настаўнікі сядзяць, як нухі за ...карою, і мараць аб павялічэньні пэнсіі.

Да гэтага часу ні адзін з настаўнікаў Старыцкага с.-савету ня толькі не прадаў ні адной аблігацыі, а нават сам ня купіў і не правёў ніводнага растлумачальнага сходу з сялянствам.

Соромна трохі, хлопцы!

Селькор Гай.

...ровесность" з душком.

...е кніжкі вучаніцы Брагінскае школы II ст.)

УСТУП.

...біраюся ў чым небудзь ві... ...чыняў гэтае школы—вучні, ...е я палохаюся за іх па... ...ю, з небясьпекаю гляджу ...льне іх ідэалёгіі пад уплы... «душещипательных» сказаньняў ...адчыны расейскае літаратуры. Ра... ...тым напярэджваю чытаючых, што ...кі, з якімі вы пазнаёміцеся, ...запісную кніжку не выпад... ...дыктоўку настаўніцы. Дык ...да аналізу „навуковага ...чэснае кніжкі вучаніцы, у ...пісных кніжак усіх вуч... ...рупы (асноўнай і роўналеж... ...ай дысцыпліне.

Поэтическим мы называем произведение словесности, ко... ...ается произведением ...скусства, а прозаическим ...ем то произведение ...и, которое не есть про... ...изящного искусства"... ...такое „клясычная" тлу... ...мачала ... „ёскі „Менча... ...у шляхэцтве". Усё, што ня верш— ...роза, усё, што ня проза—верш. Праў... ...там жонка за такія разважаньні ...чыла свайго чалавека кар'ятам і, ...нават, навярнулася да яго задам, а ...ут вучні ня толькі не павярнуліся за... ...ам, а нават... занесьлі ў свае запі... ...ныя сшыткі."

Вядома, дзеці...

„О СМИРЕНИИ И ПРЕКРАСНЫХ ДУШАХ".

Як нам вядома з гісторыі, нашы продкі, бу...чы дзікунамі, «смирялись» перад прыродай, не разумеючы яе праяў. Вядома, „неразумныя" былі людзі. Сучасны-ж чалавек настолькі вырас і разьвіўся, што нават мае «дерзость» «сьміяць» перад сабою прыроду.

...та прагрэсу, як відаць, выклад... ...літаратуры, выхаваня ў панскіх ...ах, не зьбачыла, не заўважыла, ...а чаго ў яе ўяўленьні ...ца і сёньняшні дзень застаецца перагада... ...сфінксам, ідалам:

... Красота есть живая действительность природы, одно из явлений жизни... (накшталт, кій—палка, палка—кій. П. В.).

Прырода ...ы толькі ўяўляе сабою харак... і...

...расные тела и ... што нават ...енный богат... воскли... ...: ... мир ...и

Ідэалёгічная вартасьць прыведзеных вытрымак і радкоў дзеля ўсіх, хто хоць каплю мае здаровага пралетарскага чуцьця, відочна. Але я хачу зьвярнуцца да настаўніцы з перасьцярогай, што ад такое харчы ў вучняў урэшце зьявіцца блявота, а тагды ўжо ёй прыдзецца чырванець і тагды ўжо ёй вучні перастануць верыць.

ПАКЛЁП НА МАСТАЦТВА.

Настаўніца аказалася вытрыманай да канца і сваю тэорыю аб мастацтве давяла таксама да канца, высунуўшы перад вучнямі наступныя задачы мастацтва:

„... 1. Постижение красоты мирских явлений (идей вечной красоты)

2. Воплощение идей вечной красоты в произведениях искусства.

3. Обогащение жизни человечества красотою.

Таксама і супроць гэтых радкоў нічога ня маю, але дзеля яне становіцца дзіўным, як гэта ў маленькай галаве дванаццацігадавога вучня могуць умясьціцца такія вялікія ідэі „вне времени и пространства".

Бедныя вучні!

* * *

Вывады ясны. Ад гэтае „славеснасьці" нясе душком з крыўчанскіх панскіх палацаў (настаўніца—былая памешчыца), пахне «утонченным» мяшчанскім ідэалізмам, новым ідалапаклонствам, прыкрытым тэорыяй чыстага хараства, чыстага мастацтва.

Маё пажаданьне (думаю, што і вучні з гэтым згодзяцца)—пазбаўце вучняў ад гэтага, ня зусім прыемнага душка. Бо куды-ж далей ісьці, калі ў вучнёўскія запісныя сшыткі нападаюць вершы накшталт

...чи

Бяз назвы.

(Нібы фэльетон).

Прызнацца, я назву хацеў даць, нават напісаў—«Разумныя людзі». Напісаў, наглядзеў і падумаў—хоць тое, што яны разумныя і праўда, але многія гэтаму могуць не паверыць.

Закрэсьліў, напісаў —«Неразумныя людзі», зноў падумаў—хоць гэтаму могуць многія паверыць, але-ж гэта няпраўда. Ды і навошта народ абражаць.

Лепш няхай кожны чытач дасьць назву па ўласным смаку.

А цяпер да справы.

... Наступнае, таварышы, пытаньне—

Зубы.

— Зу-у-убы? Якія, чыс?

— Хвілінку. Справа вось ў чым: нехта давёў страхкасе, што адсутнасьць зубоў у жывога чалавека (пакойнікі абыходзяцца) вельмі шкодзіць здароўю. Грунтуючыся на гэтай навуковай ісьціне, страхкаса парашыла—уставіць сваім беззубым застрахаваным залатыя зубы.

Твары прысутных расплыліся ад шырокай ухмылкі: гэта-ж ня жарты—зубы, дарэмна, ды яшчэ і залатыя.

— Дык вось, таварышы, на наш групком, які яднае 260 сяброў саюзу, вызначана... 12 зубоў!

Цішыня. На тварох прысутных, заміж прыемнай ухмылкі, зьявіўся нейкі сум. Кожны падлічвае: 260 сяброў, ды калі мінімум на кожную галаву ў сярэднім паўтара хворыя зубы, то трэба 390 зубоў, а маецца...

Адзін з прысутных, мусіць, самы храбры, ачухаўся першым і кажа:—прапаную сабраць весткі аб ліку беззубых, выбраць з іх самых беззубейшых і бяднейшых і накіраваць іх у рамонт.

Прапанова нібы і нішто сабе. Але гэта так здаецца збоку, а вось групкомшчыкам яна не спадабалася. Ды яно і верна—260 чалавек, зьбірай весткі, глядзі ў рот, лічы зубы...

Куды гэта работа варта?

І вырашылі справу проста, без валакіты (хай яе агонь спаліць!) і нават біз спрэчак—

— Зубы дасталіся: двум сябрам групкому, тэхнічнаму сэкрэтару таго-ж групкому № 2, што ў Менску па Ленінскай і яшчэ тром асьветнікам, не сябром групкому, але злым людзі кажуць, што гэтым «трос» жывуць з групкомшчыкамі ў згодзе.

Ну, як?

А мы кажам, што валакіта пануе.

Дзе-ж тут валакіта?

Вы думаеце, што групкому працасьветы № 2 у пяршыню так справу вырашаць?

Не.—Талоны на мануфактару разьмеркавалі прыблізна такім-жа парадкам. Апісваць ня варта.

Камлюк.

Грамадзкая праца Гарадзецкае 7-мігодкі.

Наша савецкая ўлада ставіць мётай выхаваць з дзяцей рабочых і сялян добрых і працаздольных грамадзян, якія-б змаглі быць будаўнікамі сацыялістычнае грамады. Наша школа, асабліва сёлета, гэту задачу, як ніколі ў яе існаваньні, пачала ажыцьцяўляць.

У школе пазакласныя заняткі—усякія гурткі і г. д. Разам з вучнямі гурткі наведвае і вясковая моладзь. Драмгурток вельмі часта ставіць спэктаклі для сялян. Увосень мінулага году вучні рабілі суботнік—паправілі вуліцы вёскі і кенскія дарогі.

У вёсцы сяляне нават і не уяўлялі сабе, што гэта такое за радыё. Але вучні паставілі на сваім,—па надпісным лісту сабралі ў школе грошы, колькі патрэбна на радыёпрыёмнік і 30-га студзеня гэтага году ў Гарадцы пачулі Менск, Маскву.

Акрамя вучняў, шмат і сялян слухаюць школьнае радыё.

— Малайцы вашы дзеці!—яны сваёй арганізацыяй усё што захочуць зробяць. Нават яны нам старым далі магчымасьць паслухаць Маскву, Берлін, Варшаву, Менск, Харкаў і іншыя гарады сьвету.

Школа ў с.-савеце ўзялася распаўсюджваць 200 рублёў аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Некаторыя вучні пабралі індывідуальна аблігацый, а некаторыя калектыўна падпісаліся.

Пры школе існуе карэспандэнцкі гурток, сябры якога асьвятляюць жыцьцё школы: у насьценнай газеце і ў іншых газэтах і часопісах як беларускіх, так і расейскіх. Шмат грамадзкай працы ягічэ вызначана школай правесьці ў далейшым, асабліва вясной.

Сяляне З. Такаленка і У. Бялькеў.

Бабруйшчына, Гарадзец.

Наркамасьветы, зьвярні ўвагу.

На 2-й сесіі ЦВК БССР, народны камісар асьветы тав. Баліцкі ў сваім дакладзе аб сыстэме нарасьветы, адносна вячэрніх рабфакаў сказаў: „Я павінен зазначыць, што за вячэрнімі рабфакамі ў нас вялікая будучыня. Вячэрнія рабфакі мы будзем пашыраць... і далей кажа—Вячэрнія рабфакі набываюць больш значэньня, чым днаўныя". Вось думка Наркамасьветы адносна вячэрніх рабфакаў. У гэтым годзе ў першы раз пры Менскім рабфаку арганізаван вячэрні рабфак і ў ім далёка ня гэтак абстаіць справа, як гаварыў т. Баліцкі на сесіі адносна вячэрніх рабфакаў. Менскі вячэрні рабфак ужо на парозе распаду, а Наркамасьветы выбіраецца пашыраць вячэрнія рабфакі.

У чым-жа тут справа?

Калі запытаць у любога рабочага і селяніна, ці хоча ён вучыцца, атрымаеш адказ: хочу... дайце толькі магчымасьць.

Заліві гэтага году на вячэрні рабфак таксама паказалі вялікую запікаўленасьць да вучобы з боку рабочых.

З першых дзён заняткаў наведваньне Менскага вячэрняга рабфаку было добрае. Праз некаторы час пачалося адсёйваньне, або дзень прыдзе, а тыдзень няма на заняткох. А к студзеню налавіна студэнтаў кінула хадзіць.

Чаму яны кінулі хадзіць?

Таму, што да арганізацыі вячэрняга рабфаку, Наркамасьветы не дагаварыўся з адведнымі партыйнымі і прафсаюзнымі органамі аб тым, што студэнтаў вячэрняга рабфаку трэба разгрузіць і даць магчымасьць займацца.

Між тым адміністрацыя Менскага рабфаку не пакланацілася і не знайшла патрэбным вырашыць з адведнымі органамі пытаньне адносна разгрузкі.

Далей.

З 1-га да 10 лютага праводзіліся пазыкі, якія толькі процэнтаў на 50 апраўдалі сабе.

Апроч гэтага маюцца некаторыя перабоі ў заняткох, часта не зьяўляюцца настаўнікі, а замены не даюць.

Адным словам трашчыць гроты і ...ку мала.

Студэнт.

ЗАГАТОУКА ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ.

Як ідуць загатоўкі.

(Па тэлефону ад ул. карэспандэнтаў).

Ворша, 23-2. За апошнюю дэкаду лютага сельска-гаспадарчая кааперацыя акругі загатовіла валакна лёну 1006 пуд., скуранай сыравіны буйнай—112 шт. і дробнай—1021 шт.

Самахвалавічы, 23-2. За другую дэкаду лютага мясцовая спажывецкая кааперацыя загатовіла розных хлебных культур 176 пуд., семя лёну—102 кгр. і рознай сыравіны—на 60 руб.

Фаніполь, 23-2. Мясцовае спажывецкае таварыства за апошнія дзесяць дзён лютага загатовіла хлебных культур 156 пуд., рознай сыравіны на 30 руб., а з пачатку кампаніі ўсяго загатоўлена на 1446 руб.

Барысаў. 23-2. Барысаўскае прыгарадзкае спажывецкае таварыства за час з 1... да 20 лютага загатовіла семя лёну 67 пуд, скуранай сыравіны—на 416 р., пушнины і іншай сыравіны—на 1776 руб. За гэты-ж час сабрана палявой надоімкі 855 руб.

Азьдзяцічы, 23-2. Азьдзяцідкае спажывецкае таварыства за другую дэкаду лютага сабрала пайвых узносаў 416 руб. і загатовіла хлеба 253 пуд., скуранай сыравіны—на 150 р., пушнины і іншай сыравіны—на 263 руб.

Вілейка, 23-2. Нашае спажывецкае таварыства за час з 10 да 20 лютага загатовіла хлеба звыш 200 пуд., шчаціны і іншай экспартнай сыравіны на 150 руб.

Вайскоўцы даюць прыклад.

ГОМЕЛЬ, 23-2. (Ул. кар.). Рэалізацыя аблігацый пазыкі ў вайсковых часьцях праходзіць з посьпехам. Чырвонаармейцы высунулі лёзун—«не павінна быць ніводнага вайскоўца, які-б не падпісаў пазыку». У вайсковых ...ьшчыны на 22 лю... ...а аблігацый пазы... ...у Рэчыцкім райо...

Заданьне выканалі з перавышэньнем.

ГОМЕЛЬ, 23-2. (Ул. кар.) Лоеўскае спажывецкае таварыства за 5 дзён (з 10 да 15 лютага) загатовіла 2000 пуд. збожжа і на 300 руб. рознай іншай сыравіны. Трэба сказаць, што т-ва ў галіне хлебазагатовак заданьне на 15 лютага выканала з вялікім перавышэньнем: заданьне прадугледжвала загатоўку 1200 пуд. жыта і 200 пуд. іншых культур, а загатоўлена збожжа агулам 4893 пуды.

Што загатовіла с. г. кааперацыя ў Меншчыне.

Сельска-гаспадарчая кааперацыя Меншчыны за другую дэкаду лютага загатовіла: жыта 39,9 тон аўса—18 тон, ячменю—33,4 тоны, семя-лёну—1,3 тоны, буйнай скуранай сыравіны—на 7105 рублёў, дробнай—на 3248 руб., мяса—на 12500 руб. і рознай сыравіны больш як на 3500 руб. Усяго-ж за гэты час загатоўлена на 44441 руб.

Новыя заводы павялічаць экспарт

Управа Дзяржгандлю Беларусі ўнесла ў Дзяржплан шэраг прапаноў аб арганізацыі прадпрыёмстваў, якія павінны адыграць значную ролю ў павялічэньні і разьвіцьці экспарту.

Сьпынімся на некаторых з іх.

Існуючыя ў БССР кішачныя заводы, арганізаваныя 30-35 год таму назад, так устарэлі, што з новага гаспадарчага году на шмат якіх заводах пры сучасным іх стане работа вробіцца немагчымай. Гэтыя заводы яшчэ не мэханізаваны, што, безумоўна, дрэна адбіваецца на якасьці выпускаемай прадукцыі. Управа Дзяржгандлю лічыць неабходным пашырыць і перабудаваць Віцебскі, Гомельскі і Менскі заводы; апроч гэтага дзеля разьвіцьця кішачнай прадукцыі неабходна зараз-жа распачаць пабудову дзесяці новых дробных кішачных заводаў у тых пунктах БССР, дзе кішачная сыравіна да гэтага часу не перапрацоўвалася, а іменна ў Шклове, Талочыне, Горках, Быхаве, Пухавічах, Дрысе і інш.

Калі гэтыя мерапрыёмствы будуць ажыцьцёўлены, то экспарт кішак павялічацца на 50-60 тысяч рублёў у год.

Далей, дзеля атрымання ...экспартнага альбуміну неабходна пабу... ...два альбуміновыя заводы: адзін в... Віцебскай, а другі пры Гомельскай бойні... ...ры дробных заво... Калі працу расп... зараз-жа, то яе можна скончыць у п... ягу 3-4 месяцаў. Заводы гэтыя могуць даць у год альбуміну прыблізна 10 0... пуд. Гэтыя прадукцыя можа ў значнай м... павялічыць нашыя экспартныя рэсурсы пры параўнаўча невялікіх грошовых выдатках з нашага боку.

Управа Дзяр... ...оўвае таксама пытаньне аб абсталяваньні па Беларусі заводу па выбару журавінага экстракту.

На замежных рынках—ходкі тавар рыбная луска. Гэта новы від экспарту нам неабходна разьвіваць, і абсталяваньне майстэрні па апрацоўцы рыбнай лускі выклікаецца самім жыцьцём. Невялікія сродкі, выданыя на абсталяваньне гэтай майстэрні, у выніку значна павялічаць экспарт.

Грыбы, як вядома, займаюць значнае месца ў нашым экспарце, а таму Управа Дзяржгандлю лічыць неабходным набудаваць спэцыяльнае памяшканьне для сартаваньня грыбоў; апроч таго, выклікаецца неабходнасьць набудаваньня невялікага заводу для марынаваньня грыбоў, што, безумоўна, павялічыць іх рэалізацыйную цану.

І, урэшце, трэба ўзяцца за абсталяваньне цэлага шэрагу новых смалярных заводаў, каб павялічаць экспарт прадукцыі гэтай прамысловасьці.

Беларускі прамысловы саюз баматужнікаў намецеў да набудовы 75 смалярных заводаў, а Управа Дзяржгандлю лічыць неабходным дадаткова набудаваць яшчэ 25 заводаў і адзін завод для пераапрацоўкі смалы і аўстэкі ...ігіляцыі. Гэтыя заводы павінны быць набудованы РВК і гарадзкімі камбінатамі, прычым эксплёатацыя гэтых заводаў будзе знаходзіцца ў іх ведамасьці.

Абсталяваньне смалярных заводаў павялічыць экспарт на 200 тысяч рублёў у год і апроч таго, значна палепшыць якасьць прадукцыі.

Калі гэтыя мерапрыёмствы будуць ажыцьцёўлены своячасова, то яшчэ ў бягучым годзе можна будзе павялічыць экспарт на 100.000 руб., а пачынаючы з будучага году на паўміліёна рублёў у год. Леўсні.

ЮБІЛЕЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

КАМУНІСТЫ БЫЛІ, ЁСЬЦЬ І БУДУЦЬ ГЭРАІЧНЫМІ САЛДАТАМІ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, АВАНГАРДАМ РАБОЧЫХ, КІРАЎНІКАМІ ПРАЦОЎНЫХ У БУДАЎНІЦТВЕ САЦЫЯЛІЗМУ І Ў АБАРОНЕ ЯГО АД КЛЯСАВЫХ ВОРАГАЎ.

СТАРШЫНЯ ЦВК БССР СЯРОД БАЙЦОЎ.

ТАВ. ЧАРВЯКОУ—ГАНАРОВЫ КУРСАНТ ПАЛКАВОЙ ШКОЛЫ 6 ПАЛКА.

22 лютага Чырвоная заля поўна. Сярод чырвонаармейцаў — прадстаўнікі рабочых, сялян, былых байцоў і г. д.

У прэзыдыум урачыстага сходу 6 палка абіраецца тав. Чарвякоў, які выступае з прывітаньнем.

Адзначыўшы моц Чырвонай арміі, яе гістарычнае мінулае, тав. Чарвякоў перайшоў да тых задач, якія стаяць перад Чырвонай арміяй і краінай у сучасны момант.

Падкрэсьліўшы, што горад і вёска павінны ведаць, як змагацца ў будучых бойках, тав. Чарвякоў кажа: «Трэба так выхаваць масу, каб кожная дзяўчына лічыла недапусьцімым для сябе выйсьці замуж за таго, хто ўхіляецца ад службы ў Чырвонай арміі».

Тут заля ня вытрымлівае, гучныя воплескі з крыка... «ура», „няхай жыве ўсебеларускі старшыня" зьліваюцца ў баявое прывітаньне.

Тав. Чарвякоў скончыў. Устае чырвонаармеец і ўносіць прапаноку: «АБАБРАЦЬ ТАВ. ЧАРВЯКОВА ГАНАРОВЫМ КУРСАНТАМ ПАЛКАВОЙ ШКОЛЫ".

Ганаровы курсант кажа:—„Я лічу вялікім гонарам быць чырвоным салдатам, бо ўсё маё жыцьцё накірована на барацьбу за справу рабочых і сялян».

Пасьля полк віталі рабочыя, сяляне, піянэры, якія падкрэсьлілі вялікую працу палка па ваенізацыі насельніцтва.

У гэты дзень полк выдаў падарункі лепшым стралкам, лыжнікам, вайскорам і іншым.

С. К.

Сердзіч,

камандзір і камісар № Самарэкай кавалерыйскай дывізіі.

Сын селяніна, сам—рабочы. Пры ўладзе Керанскага за бальшавіцкую агітацыю прасядзеў два з паловаю месяцы ў турме. У кастрычніку 1917 году тав. Сердзіч

паступіў у Чырвоную гвардыю, а пасьля—у Чырвоную армію.

Нагароджан ордэнам Чырвонага Сьцягу за штурм Чонгарскай пазыцыі. У той час ён камандаваў 2-ю брыгадаю 6-й дывізіі. За гэты штурм дывізія атрымала назву „Чонгарская".

Сьвята Чырвонай арміі ў Менску.

Па-сьвяточнаму.

Горад сьвяткуе. Разьвяваюцца чырвоныя сьцягі. Разьвешаны лёзунгі, плякаты. Па гораду раскінута сетка гучнагаварыцеляў, праз якія перадаюцца даклады аб 10-хгодзьдзі Чырвонай арміі.

Урачыстыя сходы.

Учора, 23 лютага, у рабочых клюбах Менску адбыліся ўрачыстыя сходы чырвонаармейцаў з сапрыхільнымі рабочымі арганізацыямі. На вечарох праведзены даклады аб 10-хгодзьдзі Чырвонай арміі, а таксама адбыліся ўспаміны ўдзельнікаў грамадзянскай вайны. Апроч гэтага, адбыліся ўшанаваньні прыкладных чырвонаармейцаў і лепшых стралкоў з рабочых.

Байцы апавядаюць аб мінулых днях.

Да сьвяткаваньня падрыхтавалася і савецкая школа. Учора па школах адбыліся вечары, на якіх старыя байцы ўспаміналі аб гэраічным мінулым Чырвонай арміі. У дні сьвяткаваньня адбудуцца таксама дзіцячыя рапішнікі.

Прыезд прадстаўнікоў ангельскага пралетарыяту.

У дні сьвяткаваньня 10-хгодзьдзя Чырвонай арміі ў Менск прыяжджаюць т. т. Вільсон і Гартнэр—прадстаўнікі ангельскага пралетарыяту.

Прадстаўнікі азнаёмяцца з бытам чырвонаармейскай падшэфнай дывізіі.

Выстаўкі барацьбы і пабеды.

Учора ў Доме Чырвонай арміі адчынілася выстаўка, прысьвечаная 10-х годзьдзю Чырвонай арміі.

Выстаўка характарызуе быт 1 вучобу Чырвонай арміі. На выстаўцы ёсьць таксама куток чырвонаармейскай творчасьці. Гэткія-ж выстаўкі адчыніліся ў бібліятэцы Пушкіна і ў аб'яднанай лайсковай школе імя ЦВК БССР.

Чырвонай арміі—прывітаньне.

Сотні, міліёны працоўных усяго сьвету пасылаюць сёньня прывітаньне—прывітаньне Чырвонай арміі, першай і пакуль што адзінай у сьвеце пралетарскай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Дзесяць гадоў. Дзесяць гадоў палітыкі міру, палітыкі ажыцьцяўленьня капіталістычнага прыгнечаньня над працоўнымі зямной кулі, дзесяць гадоў, якія ідуць востра наперакор палітыкі капіталістычных краёў—вось палітыка савецкай улады, за якую стаіць, абаранае і будзе змагацца Чырвоная армія.

Няхай сусьветная буржуазея „сакрэтна" будуе пляны, няхай узьнімаюць пашы ворагі меч вайны, вайны контр-рэвалюцыйнай змовы проці Савецкага Саюзу, першай пралетарскай дзяржавы на зямной кулі, няхай кідае першыя снарады міжнародная контр-рэвалюцыя,—яны спаткаюць магутны сталёвы адпор ня толькі арганізаванай Чырвонай арміі, але і шырокіх мас рабочых і сялян, працуючых пад сьцягам камуністычнай партыі і па заветах Ільліча.

Дзесягаловае сьвята Чырвонай арміі—сьвята працоўных усяго Саюзу. Дзесяцігадовы юбіляр—ён варты самай вялікай пралетарскай удзячнасьці і нагароды.

Няхай калоціцца ў дзень 10-цігодзьдзя Чырвонай Рабоча-Сялянскай арміі ўвесь капіталістычны сьвет ад магутнага рэвалюцыйнага «ура».

Яшчэ больш увагі шырокіх мас працоўных да справы самаабароны СССР і яе складаній і непадзельнай БССР.

М. Карклін.

МЫ З ВАМІ!

Чырвонаармейцам Беларусі.

(Ліст, атрыманы на мове эспэранто).

ТАВАРЫШЫ, ЧЫРВОНЫЯ БАЙЦЫ!

Ніжэй падпісаўшыяся рэвалюцыйныя рабочыя арганізацыі з буржуазна-дэмакратычнае краіны Аўстрыі вітаюць Вас у дзень 10-хгодзьдзя існаваньня непераможнай Чырвонай арміі. Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў вялікай Расеі скінула тырана-цара, а разам з ім і капіталізм.

Маладая рэвалюцыя ямаль з нічога стварыла вас ў вялікую магутную Чырвоную армію, якая адважна абаранае першую бацькаўшчыну пралетарыяў усіх краін.

Ваша барацьба шмат гадоў ...ла ...ці рэакцыянэраў, ...ых армій, якіх падтрымлівалі капіталісты ўсіх краін.

Прайшлі гады, пакуль, урэшце, ваша армія перамагла і пачалося мірнае будаўніцтва першай пралетарскай дзяржавы ў сьвеце.

Але ваша праца яшчэ ня скончана. Ва ўсім сьвеце, апроч СССР, пралетарыят стогне пад пятой фашысцкага капіталізму. Ваша праца, а таксама праца пралетарыяў усіх краін скончыцца толькі тады, калі вызваліцца ўвесь сьвет беднякоў і над абшарамі зямлі будзе ўзьняты чырвоны савецкі сьцяг.

Таварышы! Сусьветны капіталізм узбройваецца проці чырвонай дзяржавы. Чырвоныя браты! Будзьце гатовы! Хутка прыдзе час, калі вы ізноў будзеце ваяваць. Ваяваць, але ўжо ў апошні раз. І вашы чырвоныя штыхі перамогуць сусьветных дзяржаў.

Чырвонаармейцы! Сусьветны пралетарыят заўсёды з вамі. Няхай жыве Чырвоная армія! Няхай жыве ленінізм! Няхай жыве Камінтэрн—кіраўнік сусьветнай рэвалюцыі!

ПЭНТЭ К... ...АМПАРТЫІ АЎСТРЫІ.
СЭКРАТАРЫЯТ САЛДАЦКІХ ГРУП КАМПАРТЫІ АЎСТРЫІ.
ЦК КАМСАМОЛУ АЎСТРЫІ.
ЦК МОПР'У І ІНШЫЯ.

ЛІСТ АД ЗАХОДНЯ-САКСОНСКАГА КАМІТЭТУ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ.

Чырвонаармейцы Беларусі!

У дзень 10-годзьдзя Чырвонай арміі мы шлем Вам нашэ братэрскае прывітаньне.

Быў час, калі мы жылі надзеяй на тое, што Чырвоная армія рабочых і сялян будзе арганізавана ў нас. Былі абязброены афіцэры, а ў часьцях былі арганізаваны саветы салдацкіх дэпутатаў.

10 год «нямецкая рэспубліка» мае на чале свайго ўраду сацыял-дэмакратаў. Што зроблена ўрадам, каб арганізаваць чырвоную армію? Нашы правадыры К. Лібкнэхт і Роза Люксэмбург былі забіты рукой Носке, Эбэрта, Шэйдэмана і інш.: яны здрадзілі рэвалюцыі. Ня Чырвоная армія, а фашысцкія банды стаяць на варце інтарэсаў «вольнай нямецкай рэспублікі». Паступова манархічны ўрад выжывае з сваіх шэрагаў сацыял-дэмакратаў. Чорная рэакцыя падпімае галаву.

Але, ня гледзячы на гэта, чырвоны фронт узмацняецца. Саюз чырвоных франтавікоў, заснаваны ў 1924 годзе, зараз зьяўляецца моцным басьціёнам нямецкага рабочага руху. Разам з камуністычнай партыяй і дапамогай другіх рабочых арганізацый мы змагаемся, каб скінуць эксплёататараў і здраднікаў—і стварыць адзіны чырвоны фронт.

Мы добра ведаем аб вялікім значэньні Чырвонай арміі. Мы абіраем вам у дзень вашай 10 гадавіны Чырвонай арміі і надалей змагацца пад сьцягам Леніна і ўсімі сіламі дапамагаць ажыцьцявіць сусьветную рэвалюцыю!

Няхай жыве Чырвоная армія! Няхай жыве Камінтэрн—наш баявы штаб.

Няхай жыве адзіны сусьветны чырвоны фронт!

Кіраўніцтва Заходня-Саксонскім К-там Ч. Ф. Н. ГОФМАН, АЛЬБРЭХТ, БЭСЬЛЕР.

Як мы, стаўшы „белымі", выратавалі 420 чырвоных байцоў.

(З успамінаў фронту).

5 кастрычніка 1918 году заняўшы горад Сарапул, штаб дывізіі з нецярпліваасьцю чакаў прыходу нашай флотыліі, у задачу якой уваходзіла адбіць у белагвардзейцаў нашых таварышоў узятых у палон і адвезеных на баржы ў часе наўстаньня.

Урэшце, 6 кастрычніка прыбылі параходы пад кіраўніцтвам тав. Раскольнікава.

Уночы нянрыкметна яны зьніліся з якары і пайшлі ў невядомым напрамку. Удасца ці не іх сьмелая спроба, вось якое пытаньне хвалявала рабочых Сарапула і байцоў нашай дывізіі. Бо на гэтай баржы белагвардзейцы павезлі з сабой 600 чал. лепшых партыйных таварышоў, лепшых савецкіх працаўнікоў, не пасьпеўшых уцячы з гораду. Разам з імі павезлі і сялян—старшынь сельсаветаў і членаў валыканкомаў. Шмат гутарылі і хваляваліся аб лёсе гэтай страшэннай баржы. Адны казалі, што белыя спалілі баржу, іншыя, што яна затоплена і, урэшце, што трум не напоўнен водою да палавіны і яна пастаўлена на якар сярод рэчкі Камы. Прайшла трывожная ноч, а калі пачало сьвітаць баржа з арыштаванымі падышла да берагу. Калі мы пайшлі спатыкаць ... перад нас ... нак: з тр...

пабітымі тварамі выйшлі 420 таварышоў лепшых прадстаўнікоў рабочых і сялян гораду і вёскі. А дзе-ж апошнія 180? Яны растраляны, паколаты штыхамі, забіты шомпалами і кінуты ў Каму. Шмат радасьці і сьлёз выклікала гэтае спатканьне.

З бурнымі воплескамі, на руках быў узьнесен на трыбуну тав. Раскольнікаў, які расказаў пра вызваленьне арыштаваных.

Уначы нянрыкметна наш параход падышоў да баржы з арыштаванымі, якая стаяла амаль што на сярэдзіне ракі. Каб ня выклікаць нерапалоху сярод белагвардзейскай варты, нам прышлося пайсьці на хітрасьць.

Карыстуючыся цемнатой, мы выдалі свой параход за белагвардзейскі і перадалі, што баржу трэба перавесьці ў Сарапул, куды прыедзе камісія па разгляду справы арыштаваных. Здача была сакратная. Наша хітрасьць удалася. Начальнік белагвардзейскай варты хоць і ў неразуменьні, але на пасьмеў адмовіцца. Параход узяў на буксыр баржу і хутка пайшоў у напрамку Сарапула.

Толькі пасьля таго, як ... адлегласьці 2-3 вёрст ... распачала па ... ўжо позна

Выраб прамтавараў павялічваецца.

(Гутарка з старшынёю ВСНГБ тав. Карпам).

У апошні час прамысловасьць Беларусі перажывае недахваты сыравіны, што адбіваецца на выкананьні прам.-фінансавага плану. Гэта становішча зараз палепшаецца, са выключэньнем лёнапраднай прамысловасьці.

Трэстам дадзен загад аб павялічэньні вытворчасьці асартымэнту ходкіх прамтавараў. Апроч гэтага, будзе павялічан лік рабочых на існуючых прадпрыемствах, і ёсьць дазвол адчыніць новую кравецкую фабрыку ў Гомелі.

Трыкатажная і панчошная прамысловасьці дадзена заданьне прыступіць да выпуску тавараў, якімі можна будзе задаволіць сялянскі рынак; па скурэнай прамысловасьці—пашырыць выпуск тавараў патрэбных для вёскі, а скуранаму трэсту дазволена пусьціць у ход завод-школу, які да гэтага часу стаяў; па папяровай прамысловасьці дадзена заданьне пашырыць выпуск шпалераў для вёскі; па лініі шкляной прамысловасьці павялічваецца выраб ваконнага і лямпавага шкла, а таксама пасуды сялянскага ўжытку.

Найбольшыя мерапрыемствы ўжываецца па лініі лясной прамысловасьці: прыняты меры да пунктуальнага выкананьня шматмілённага дагавору з украінскай арганізацыяй «Сельгаспадар», да дастаўкі лесаматар'ялаў у хлебазагатоўчыя раёны і інш. Каб узмацніць экспорт лесаматар'ялаў, а таксама забясьпечыць унутраны саюзны рынак, Лесбел прыступіў да распрацоўкі Нёманскіх лясьніцтваў і да пашырэньня агульнай загатоўкі піловачнага матар'ялу на 1 млн. куб. фут. звыш вытворчай праграмы.

Сарніковай прамысловасьці дадзен загад аб пашырэньні фабрыкі «Везувій», якая загатаўляе прадукцыю для ўнутранага рынку і экспорту. За апошні квартал гэта прадпрыемства значна пашырыла сваю вытворчасьць. Колькасьць рабочых узрасла на 500 чал.

Агульныя дырэктывы дадзены аб павялічэньні выробу таварнай прадукцыі па лініі ўсіх аддзелаў мясцовай прамысловасьці. Падкрэсьлена, што ў другім квартале вытворчасьць прамтавараў павінна быць пашырана, а недавыкананьне праграмы ў першым квартале папоўнена. Праграма першага кварталу была выканана на 95 проц., прычым самае вялікае недавыкананьне было па лініі лёнапраднай прамысловасьці, якая выканала ўсяго 78 проц. заданьня, і па лініі Белдзяржсьпірту, які даў 80 проц. заданьня.

Супроць 4-га кварталу 1926-27 г. чэрвы квартал сёлетняга году ў чырвонных рублёх даў рост прадукцыі на 14 проц.

Экспортнае заданьне было выканана здавальняюча.

Перад ВСНГБ стаіць пытаньне аб пашырэньні абутковай вытворчасьці, але гэта зьвязана з вырашэньнем справы аб пабудове новай фабрыкі.

Вытворчыя магчымасьці дазваляюць разгарнуць працу лёнапрадных,—Дубровінскай мануфактуры і панчошна-трыкатажнай фабрык і перавесьці іх на 3-ю зьмену пры ўмове, што гэтым галінам прамысловасьці будзе наладжана бясперабойная дастаўка сыравіны.

За студзень сёлетняга году, у параўнаньні са студзенем 1926-27 г. (у даваенных цэнах), выраб прадукцыі ўзрос на 31 проц.

БССР наладжвае гандаль лесам з заграніцай.

Наш супрацоўнік меў гутарку з прадстаўніком беларускай дэлегацыі, якая езьдзіла за межы ў справе наладжаньня лясного гандлю. Прадстаўнік гэтай дэлегацыі, старшыня Лесбелу тав. Крафеў, паведаміў наступнае:

— Дэлегацыя езьдзіла за межы, каб наладзіць камэрцыйныя апэрацыі па продажы лесу, азнаёміцца са станам лясных рынкаў за межамі і абсьледаваць рыскую кантору Лесбелу ў сувязі з яе рэарганізацыяй.

Дэлегацыя наведала Польшчу, Данцыг, Латвію і Нямеччыну. Лесаматар'ялы, якія знаходзяцца ў райёне рэк Нёмана і Вільлі, ўдалося запрадаць фірме «Эвэлоўскі» (Эвэлоўскі зьяўляецца сапатарам гандлю і прамысловасьці ў г. Данцыгу). Лесаматар'ялы запраданы на пачатковую суму 200 тыс. руб. У далейшым продаж лесу будзе пашырацца.

За фірмай «Эвэлоўскі» стаіць дзьве буйныя данцыгскія фірмы, якія разам з Эвэлоўскім мяркуюць арганізаваць Расейска-Данцыгскае Таварыства гандлю лесам і весьці з БССР буйныя лясныя гандлёвыя апэрацыі.

Данцыгскі сэнат наладзіў банкет у гонар беларускай делегацыі, на якім былі прадстаўнікі консульства СССР у Данцыгу. На банкеце прысутнічаў віцэ-прэзыдэнт і сэнатар Данцыгу, якія ў прамовах падкрэслівалі неабходнасьць зьвязацца гандлёвымі апэрацыямі з БССР.

У Кёнігзбэргу дэлегацыя зьвязалася з буйнай лесапрамысловай фірмай і тавадзкім муніцыпалітэтам, які вызначыў камісію для азнаямленьня з лясной справай у БССР. Гэта камісія ўжо набывала ў Менску.

У Бэрліне беларуская дэлегацыя наведала буйныя лясныя прадпрыемствы і склады. Зроблены папярэднія ўмовы на 100 тыс. руб.

БІБЛІАГРАФІЯ.

НАШ КРАЙ. Штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інстытуце Беларускае Культуры. № 1(28). Студзень. 1928. Год выданьня чацьверты. Менск.

Часопіс, якая выдаецца ўжо чацьвёрты год, якая публікуе, што яна павінна быць у кожнай школе, гардоме, хаце-чытальні, клюбе і бібліятэцы, якая павінна быць настольнай кнігай кожнага краязнаўца,—я можа і ня мае права выконваць сваё заданьне абы-як, тым болей, што да яе прывешан ярлык інбелкульту.

Калі паглядзець на зьмест „Нашага Краю" за студзень г. г., дык, прымаючы пад увагу разьмер часопісі (60-70 стар.), большага з боку колькасьці матар'ялу ня можна вымагаць. Ёсьць усяго патроху. Але вось аб якасьці.. Мы тут ня хочам ганіць часопіс цалкам. Мы хочам на гэты раз зьвярнуць увагу на артыкул „Польская буржуазная навука на Беларусі».

Стыль і мова гэтага артыкулу—пэўна надзвычайнае. Возьмем хоць некалькі выразаў:

«Таварыства прывлекаў навук у Вільні было адчынена ў ліку 38 заснавацеляў» (с тар. 5).

Хто-ж тады т-ва адчыняў? Мо' губарнатар? Ды і само слова «заснавацель»—штучнае; нарасейску—«основатель». Ёсьць беларускае слова—„закладчык". „Прысьвечаны досьледам страны ў межах былога вялікага княства Беларуска-Літоўскага» (стар. 6).

Чаму „страны", а ня „краю"?

„Для досьледаў зямель усходніх рэспублікі польскай». (стр. 6).

«Зямель усходніх рэспублікі польскай»—чыста польская расстачоўка слоў.

«Ня толькі таварыства прывлекаў навук у Вільні, але і гэты Інстытут працавалі не адно над замацаваньнем свайго ўладаньня Заходняй Беларусьсю, але і над абгрунтаваньнем палітычных праў буржуазнае Польшчы»... (стр. 6).

Выходзіць, што Т-ва і Інстытут працавалі над „замацаваньнем свайго ўладаньня З. Беларусьсю". Ясны абсурд.

„Па тэрыторыі З. Беларусі знаходзіцца каля 8 бібліятэк, маючых навуковае значэньне, 16 бібліятэк зьнікла» (стар. 7 і 8).

«Архіва гэтага, было 12 архіўў раней»... (стар. 8).

„Музэяў і музэйных збораў—14, ці 4 зачынілася даўно і нядаўна, як і ў папярэдніх выпадках" (стар. 8.).

„Беларускае Навуковае Таварыства з музэем пры ім, ды кіраўнік і таго—вядомы ерэтык (? Рэд). Лудкевіч—насаджаны польскай уладай у турму» (стар. 8).

Думаецца, што рэдакцыя „Н. К." згодзіцца з намі і ў тым, што ўжываць у пераданым артыкуле такія туманныя выразы, як „зьнікла", „было раней", даўно і нядаўна", „каля 8" і г. д. ня можна—тым больш, што часопіс павінна—на словах яе ж самой—быць настольнай кнігай...

Урэшце трэба зазначыць, што аўтар артыкулу тав. К. Менскі ня зусім добра ведае гісторыю, калі піша: „На ўсёй тэрыторыі былой Польшчы 1772 году, г. зн. з Кіевам і Смаленскам" (стар. 6).

Даводзім да ведама аўтара і часопісі, што ў 1772 г. Польшча Кіевам і Смаленскам якраз не ўладала.

Што да іншых артыкулаў...

„Стары Менск"—З. І Даўгяны дае нарыс з гісторыі менскага замку і эканомжыцьця места Менску. Гэты невялічкі досьлед мае сваё значэньне тым больш, што Менск дагэтуль ня мае сваёй навукова-апрацаванай гісторыі. Няма нават выданых у друку архіўных крыніц.

Б. І. Фэдарова і праф. П. Салаўёў далі артыкулы па фауне Беларусі: першы аб сьнігірах (гілях), другі—аб вывучэньні фауны.

Цікавы артыкул А. Гарбача (і І. Цьвікевіча) аб „некаторых сродках барацьбы з малярыяй у Мазырскай акрузе". Таксама і артыкул А. Я. Крукоўскага: „Жалезная руда на Мазыршчыне» і праф. П. Салаўёва: „Цікавы рачок у Горках".

Далей ідуць: праграмы, анкеты і інструкцыі, хроніка і бібліяграфія. Аддзелы гэтыя наступлены досьлед добра.

П. Т.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. «Полымя» № 1 за 1928 г. Беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі. Цана 1 руб. 50 кап.

2. „Сьмерць тав. Вулі" М. Тайча. Раман на нурэйскай мове. Цана 2 р.

3. „Международная жизнь" № 1 за 1928 г. Літыздата Народнага Комиссарата по Иностранным Делам. Цана 1 р. 25 кап

Тэмп рэалізацыі пазыкі трэба ўзмацніць.

Рэалізацыя ў Меншчыне.

(Па тэлефону).

ТЭМП РЭАЛІЗАЦЫІ АСЛАБЕЎ.

БЯРЭЗІНА, 23-2. У нашым райёне за час з 16 да 22 лютага прададзена аблігацый пазыкі на 1200 руб., а з пачатку кампаніі—на 6200 руб. Наш райён павінен рэалізаваць на 40.000 руб., такім чынам, пакуль што рэалізавалі 15,5 проц. За апошні тыдзень тэмп рэалізацыі аслабеў.

УЗМАЦНІЦЬ ПРАЦУ.

ЗАСЛАЎЛЬ, 23-2. За апошні тыдзень у Заслаўскім райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 1462 руб. 50 кап., а з пачатку кампаніі—на 4840 руб. Пакуль выканалі менш 10 проц. заданьня.

ЗУСІМ НІКЧЭМНЫЯ ВЫНІКІ.

КАПЫЛЬ, 23-2. У Капыльскім райёне за час з 16 да 22 лютага рэалізавана пазыкі на 1200 руб., а з пачатку кампаніі—усяго толькі 3740 руб., што пры заданьні ў 60000 руб. зьяўляецца вельмі нязначнай сумай.

ЯШЧЭ СЬПЯЦЬ.

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 23-2. Нашы працаўнікі ўсё яшчэ не прачнуліся, а таму і рэалізацыя сялянскай пазыкі праходзіць вельмі марудна. К прыкладу, за апошнія сем дзён прадалі аблігацый пазыкі па ўсім райёне толькі на 175 руб., а з пачатку кампаніі—на 1810 руб. Трэба і райвыканкому праверыць працу нізавых контр-агэнтаў.

НЯ ВЫКАНАЛІ І 6 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

СЬМІЛАВІЧЫ, 23-2. Да 16 лютага было прадана аблігацый сялянскай пазыкі на 1000 руб., а за апошні тыдзень—на 1380 руб. Сьмілавіцкі райён павінен рэалізаваць 40.000 руб.; такім чынам, ня выканалі яшчэ і 6 проц. заданьня.

КРЫХУ ПАДЦЯГНУЛІСЯ.

ПЯТРОЎШЧЫНА, 23-2. У нашым сельсавеце за апошні тыдзень рэалізацыя сялянскай пазыкі крыху ажывілася. Да 16 лютага прадана аблігацый на 60 руб., а за апошні тыдзень — на 517 руб. 50 кап. Трэба працу яшчэ больш узмацніць.

ПАСОЎВАЕМСЯ НАПЕРАД.

УЗДА, 23-2. За апошні тыдзень у райёне прадана аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 1610 руб. Усяго-ж у райёне рэалізавана пазыкі на 3325 руб., што складае каля 12 проц. заданьня.

ЗАМЕСТ РЭАЛІЗАЦЫІ — НА 55 РУБ. АБЛІГАЦЫЙ.

БЕШАНКОВІЧЫ, 22-II. (Ад уласн. кар.). На агульным сходзе б. батракоў «Новага Мар'янфельда» па пытаньні аб пазыцы ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі была ўхвалена адназгодна пастанова ўсім купіць пазыку, што і было зроблена тут-жа на сходзе: прысутныя купілі аблігацый пазыкі на 55 руб.

Зроблена мала.

Водлуг вестак, да 15 лютага па БССР рэалізавана сялянскай пазыкі на 337.804 руб., што складае ўсяго 10,6 проц. заданьня. Трэба прыняць пад увагу, што ў гэту агульную суму ўваходзіць рэалізацыя пазыкі ў часьцях Чырвонай арміі, а таму, для больш правільнага меркаваньня аб ходзе кампаніі на асобных акругах, неабходна браць пад увагу рэалізацыю пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях, дзе да 15 лютага прададзена аблігацый сялянскай пазыкі на 292.301 руб., што складае 9,1 проц. заданьня па рэспубліцы.

Слабае разгортваньне кампаніі рэалізацыі пазыкі ў БССР можна бачыць з таго, напр., што па Мазырыншчыне выканана да 15 лютага каля 21 проц., а па Полаччыне ня выканана і 2 проц. Наогул, значна адстаюць Віцебшчына, Полаччына, Аршаншчына і Магілеўшчына. Сярэдняя сума рэалізаванай пазыкі на адну сялянскую гаспадарку складае па Магілеўшчыне і Віцебшчыне 17 кап., па Аршаншчыне 20 кап., а на Полаччыне ўсяго толькі 5,5 кап. Нават у тых акругах, дзе рэалізацыя ідзе больш-менш добра, сярэдні разьмер на адну сялянскую гаспадарку ўсё-ж вельмі нязначны.

Неабходна тэмп работы па рэалізацыі пазыкі ўзмацніць.

Крэдыт на ўзмацненьне сельскай гаспадаркі.

160.000 РУБ. НА РАГАТУЮ ЖЫВЁЛУ.

Праўленьне Белсельбанку адчыніла крэдыт Белсельтрэсту на 160.000 руб. Гэтыя сродкі адпускаюцца Белсельтрэсту на набыцьцё рагатай жывёлы для савецкіх гаспадарак БССР.

27720 РУБ. НА АГНЯТРЫВАЛАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Белсельбанк адпусьціў 5 акругам 27720 руб. доўгатэрмінага крэдыту на разьвіцьцё агнятрывалага будаўніцтва. З гэтай сумы Гомельскай акр. прызначана 7720 руб., а Бабруйскай, Віцебскай, Магілеўскай і Полацкай—па 5000 руб.

150.000 РУБ. НА ЗАГАТОЎКУ НАСЕНЬНЯ АЎСА.

Белсельбанк пастанавіў адпусьціць Белсельсаюзу крэдыт у суме 15.000 руб. спэцыяльна на загатоўку насеньня аўса. Разам з тым запрапанована акрсельбанкам адшукаць на мясцох яшчэ 150.000 руб. для крэдытаваньня гэтай-жа апэрацыі.

Хроніка.

Да пабудовы трамваю ў Менску.

Праэкты пабудовы трамваю ў Менску распрацоўваюцца Дзяржаўным Электрычным Трустам і Вышэйшай тэхнічнай школы ў Маскве. Абодвы праэкты будуць перададзены на тэхнічнае абмеркаваньне зьезду трамвайных працаўнікоў у Маскве, пасьля чаго найбольш адпаведны праэкт будзе канчаткова зацьверджан Дзяржаўнай Плянавай Камісіяй БССР.

Да пачатку будаўнічага сэзону праэкт трамваю будзе гатоў.

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону ў Менску.

„Торгстрой" загатовіў да пачатку будаўнічага сэзону 210 вагонаў цэмэнту, 149 вагонаў ванны, 14 вагонаў шкла, 396 тон рознага жалеза, 221 тону жалезных бэлек, 197 тон рэйкаў, 12 тысяч скрынак цьвікоў і 8 вагонаў толю.

Дзяржаўнае будаўніцтва ў гэтым годзе забясьпечана будаўнічым матар'ялам на ўсе 100 проц.

Конкурс на лепшага лістаносца.

Беларуская паштовая акруга абвясьціла конкурс на лепшага лістаносца.

Найбольш старанным лістаносцам будуць выдадзены прэміі.

Кіно-перасоўкі абслужвалі 416.000 сялян.

У 1927 годзе Беларускае Дзяржаўнае Кіно ў вёсках правяло 3053 кіно-сэансаў, на якіх прысутнічала 416.000 сялян. Сёлета працу на абслугоўваньні вёскі кіно-сэансамі мяркуецца значна пашырыць.

Гурткі першай мэддапамогі.

Акруговы камітэт Чырвонага Крыжу праводзіць арганізацыю ў Менску і акрузе гурткоў першай мэдыцынскай дапамогі. Усяго такіх гурткоў у Менску арганізавана 43 і каля 20 у акрузе. Гурткі яднаюць звыш 2.000 рабочых, служачых і іх жанок.

Працаю гурткоў кіруюць 70 лектароў.

Выстаўка вайсковай літаратуры.

У адзнаку 10-цігадавага юбілею Чырвонай арміі пры Менскім акруговым габінэце палітасвет-працы (Ракаўская, 2) адчынена выстаўка літаратуры на ўсіх вайсковых пытаньнях. Выстаўка адчынена штодня ад 4 да 9 гадзіны ўвечары.

339.000 руб. на дарожнае будаўніцтва.

У Меншчыне сёлета на дарожнае будаўніцтва адпушчана 339.000 руб. Будзе пабудавана 53 новыя драўляныя масты, 85 жалеза-бэтонных труб, адрамантаваны 24 масты і інш.

Пабудоўка крэйдавага заводу.

Менская акруговая плянавая камісія прызнала неабходным пабудаваць завод для вырабу крэйды ў в. Дзягельня, Койданаўскага райёну. На пабудову мяркуецца скарыстаць 12.000 руб. Каля гэтай вёскі ёсьць значныя запасы крэйды.

Рабунак з забойствам.

Недалёка ад м. Клімавіч, на хут. Кавалёўка, у хату гр-на А. Кіраенка ўлезьлі невядомыя злачынцы і занатрабавалі ад яго грошы за прададзенага каня. Калі гр-н Кіраенка паказаў ім, што конь у хляве, бандыты ўсё роўна патрабавалі грошай, прыставіўшы яму да галавы рэвальвэр. Дачка гр-на Кіраенкі хацела абаранiць бацьку, але бандыты застрэлілі яе.

Дазнаньнем устаноўлена, што рабунак і забойства зрабілі жыхары в. Пажары А. Мяркулаў, М. Карнавухаў і І. Ермакоў.

СУД.

Працэс 16 бандытаў.

Паказаньні сьведак.

21 лютага дапытаны падсудныя, якія абвінавачваюцца ў падсобніцтве бандзе. Шляхам паказаньняў сьведак выяўлена, што некалькі чалавек апынуліся на лаўцы падсудных з прычыны таго, што галоўныя бандыты нахлусілі на іх з мэтай адамсьціць за розныя перашкоды бандзе.

Сьведка Івановіч паказаў, што ён пільна сачыў за бандай. Бандыты Паўлючэнка і Прахарчук распаўсюджвалі сярод насельніцтва чуткі, што яны не адны, што банда вялікая і мае шмат кулямётаў.

Сьведка Паўла Тумель паказаў, што бандыт Прахарчук разьдзяваў яго дагала, клаў на зямлю, біў і нават калоў тупым нажом у сьпіну.

Сьведка Пятровіч паказаў, што бандыт Крук не даваў яму жыцьця: амаль цэлы тыдзень хадзіў, патрабуючы 100 руб. кантрыбуцыі і, урэшце, забраў 75 руб.

Скуратовіч паказаў, што, калі раніцай ён выйшаў на вуліцу, на варотах яго двара вісела пісулька гэткага зьместу: «Калі хочаш жыць і каб ня былі спалены твае будынкі, прыгатоў 100 руб. золатам».

Прамова пракурора.

У сваёй прамове пракурор Кагвіновіч сказаў, што цяжкія гады грамадзянскай вайны і бандыцкіх нападаў, якія мелі месца ў той час, прайшлі. Працоўная Беларусь мірна будуе новае жыцьцё. Але дзікія карэньні бандытызму яшчэ ёсьць і іх трэба вырваць і знішчыць. Для бандытаў—Пеўлюченка, Прахарчука пракурор патрабуе вышэйшай меры сацыяльнай абароны з дастасаваньнем амністыі ў адзнаку 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Прамова абаронцаў.

Абаронцы—Малкін, Гярновіч і Маза ў сваіх прамовах зазначылі, што цяжкіх вынікаў ад злачынства не наступіла, забойстваў і тэрораў над насельніцтвам ня было, банда нападаў на дзяржаўныя і кааперацыйныя ўстановы не рабіла, а таму падсудным павінны панесьці кару ня вельмі цяжкую.

А. Кастроў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

пра прэміраваньне супрацоўнікаў міліцыі і работнікаў камунальных рэзьніц за выкрыцьцё асоб, якія тайна рэжуць жывёлу і асоб, якія не здаюць для засолкі скуры ад забітай імі жывёлы.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Штрафныя сумы, якія спаганяюцца ў адміністрацыйным парадку за тайны забой жывёлы, альбо за ня здачу для засолкі скуры ад жывёлы разьмяркоўваюцца паступным парадкам: 20 процантаў ідзе на прэміраваньне супрацоўнікаў міліцыі, 10 процантаў на прэміраваньне работнікаў камунальных боен і 70 процантаў у даход мясцовага бюджэту.

2. Прэміяльныя сумы для супрацоўнікаў міліцыі ідуць у адпаведны адміністрацыйны аддзел акруговага выканаўчага камітэту. З гэтых сум 50 проц. выдаецца супрацоўнікам міліцыі, якія выкрылі памянёныя ў арт. 1 гэтае пастановы парушэньні, а рэшта сумы ідзе на палепшаньне быту супрацоўнікаў міліцыі.

3. Прэміяльныя сумы для супрацоўнікаў камунальных рэзьніц ідуць у адпаведны аддзел камунальнай гаспадаркі Акруговага Выканаўчага Камітэту. З гэтых сум 50 проц. выдаецца работнікам камунальных рэзьніц, якія выкрылі памянёныя ў арт. 1 гэтае пастановы парушэньні, а рэшта сумы ідзе на палепшаньне быту работнікаў камунальных рэзьніц.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Унутраных Спраў выдаць разам з Народным Камісарыятам Юстыцыі інструкцыю аб ужываньні гэтае пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Шароз.

13 лютага 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

о премировании сотрудников милиции и работников коммунальных боен за обнаружение лиц, производящих тайный убой скота, и лиц, не отдающих для засолки кожи от убитых ими животных.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Штрафные суммы, взыскиваемые в административном порядке за тайный убой скота или за несдачу для засолки кожи животных, распределяются следующим образом: 20 процентов поступает на премирование сотрудников милиции, 10 процентов на премирование работников коммунальных боен и 70 процентов в доход местного бюджета.

2. Премиальные суммы для сотрудников милиции поступают в административный отдел исполнительного комитета. Из этих процентов выдаются сотрудникам, обнаружившим указанные в 1 настоящего постановления нарушения, сумма поступает на улучшение быта сотрудников милиции.

3. Премиальные суммы для работников коммунальных боен поступают в соответствующее отдела коммунального ведомства соответствующего окружного исполнительного комитета. Из этих сумм 50 процентов выдаются работникам коммунальных боен, обнаружившим указанные в 1 настоящего постановления нарушения, сумма поступает на улучшение быта работников коммунальных боен.

4. Поручить Народному Комиссариату Внутренних Дел издать совместно с Народным Комиссариатом Юстиции инструкцию о проведении в жизнь настоящего постановления.

Председатель Совета Народных Комиссаров и Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров М.

г. Минск, 13 февраля 1928 г.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПРАПАЛЕПШАНЬНЕ ЖЫЛІШЧНЫХ УМОЎ НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКЕ ЧЫРВОНАЕ АРМІІ.

Для палепшаньня жылішчных умоў начальніцкага складу Рабоча-Сялянскае Чырвонае Арміі Эканамічная Нарада ў дапаўненьне і разьвіцьцё п. 2 пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР за 16 лютага 1928 году пра адзначэньне 10-годзьдзя існаваньня Рабоча-Сялянскае Чырвонае Арміі («Савецкая Беларусь» за 17 лютага 1928 г., № 41)—пастанаўляе:

1. Замацаваць за Кіраўніцтвам Начальніка Даставы Беларускай Вайсковай Акругі ў асобе яго прадстаўнікоў на мясцох усе жылыя памяшканьні, што займаюцца асобамі начальніцкага складу Чырвонае арміі і іх сем'ямі ў муніцыпалізаваных дамох, якія беспасрэдна экспляатуюцца органамі камунальнай гаспадаркі або арандуюцца жылішчнымі кааператывамі, а таксама ў камунальным жылішчным фондзе, які выдзяляецца ў дамох прыватных асоб.

2. Разьмер новае жылое плошчы, якая абавязкова выдзяляецца для начальніцкага складу РСЧА паводле пункту 2 пастановы ЦВК і СНК БССР за 16 лютага 1928 году ў межах 10 проц. жылое плошчы камунальных дамоў, што будуюцца, капітальна рамантуюцца і апараўляюцца—вызначаецца акруговымі выканаўчымі камітэтамі на згодзе з прадстаўнікамі вайсковага ведамства ў залежнасьці ад патрэбы начальніцкага складу ў кватэрах у данай мясцовасьці і налічча там жылішчнага фонду.

У лік паказаных вышэй агульнай плошчы, якая выдзяляецца для вайсковага ведамства, органы камунальнае гаспадаркі могуць замацоўваць за ім пасобныя памяшканьні, а таксама і асобныя жылыя дамы.

3. Пасобныя дамы, замацаваныя за вайсковым ведамствам (п. 2), рамантуюцца і ўтрымоўваюцца за яго кошт. Арэндная плата за паказаныя дамы бярэцца органамі камунальнай гаспадаркі з вайсковага ведамства толькі ў суме амортызацыйных адлічэньняў у разьмеры ня больш 1,5 проц. будаўнічага кошту замацаваных будынкаў у дзень здачы. Арэндная плата за дамы, якія маюць гандлёвыя і складачныя памяшканьні, устанаўляецца па згодзе з органамі камунальнай гаспадаркі ў адпаведнасьці з дзеючымі законамі. Дамы, замацаваныя за вайсковым ведамствам, перадаюцца яму паводле асобных актаў, у якіх паказваецца становішча гэтых дамоў. Адказнасьць за захаваньне дамоў у спраўнасьці ўскладаецца на Кіраўніцтва Начальніка Даставы Беларускай Вайсковай Акругі ў асобе яго мясцовых органаў.

4. Кватэрная плата за выдзеленыя пасобныя памяшканьні ў дамох, якія не замацаваны за вайсковым ведамствам, плаціцца асобамі начальніцкага складу, што жывуць у іх, на агульных падставах.

5. Аддадзеная для начальніцкага складу жылая плошча ва ўсіх замацаваных памяшканьнях засяляецца на працягу 20 дзён паводле загаду Кіраўніцтва Начальніка Даставы Беларускай Вайсковай Акругі ў асобе яго прадстаўнікоў на мясцох. Выдадзеныя загады павінны рэгістравацца ў органах камунальнай гаспадаркі.

Увага 1. Памяшканьні, не скарыстаныя вайсковым ведамствам на працягу 20 дзён пасьля дачы іх, а таксама і памяшканьні, апарожненыя, але не заселдныя на працягу гэтага тэрміну, аддаюцца назад у камунальны фонд для скарыстаньня на агульных падставах.

Увага 2. Калі пасобы начальніцкага складу звольняцца са службы ў Рабоча-Сялянскае Чырвонае Арміі, то іх памяшканьні ў дамох, поўнасьцю не замацаваных за вайсковым ведамствам, выключаюцца з ліку памяшканьняў вайсковага ведамства і пераводзяцца ў агульны камунальны фонд.

6. Органы камунальнай гаспадаркі вядуць кантроль за правільным скарыстаньнем і ўтрыманьнем замацаваных за вайсковым ведамствам памяшканьняў і пасобных дамоў. Калі замацаваныя пасобныя дамы будуць скарыстаны вайсковым ведамствам ня поўнасьцю або не па прызначэньню, то акруговыя выканаўчыя камітэты могуць адбіраць гэтыя дамы.

7. З часу апублікаваньня гэтай пастановы касуецца пастанова Эканамічнай Нарады БССР за 20 мая 1927 г. „Аб палепшаньні жылішчных умоў начальніцкага складу Рабоча-Сялянскае Чырвонае Арміі".

Старшыня Эканамічнай Нарады пры СНК БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР В. Крывіцкі.

22 лютага 1928 году.
г. Менск.

Постан

Экономического Совета Народ

ОБ УЛУЧШЕН УСЛОВИЙ НАЧАЛ ГО СОСТАВА РАБО ЯНСКОЙ КРАСНОЙ

В целях улучшения жилищных начальствующего состава Рабоче-Крестьянской Красной армии Экономическое совещание в дополнение и развитие п. 2 постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР от 16 февраля 1928 года о предоставлении 10-летия существования Рабоче-Крестьянской Красной армии («Савецкая Беларусь» за 17 февраля 1928 г. № постановляет:

1. Закрепить за Управлением Начальника Снабжения Белорусского Военного Округа в лице его представителей в все жилые помещения, занимаемые начальствующего состава Красной армии с семьями в муниципализированных домах, как непосредственно находящиеся в ведении органами коммунального хозяйства, арендуемых жилищными кооперативными товариществами, а также в частных домах в той площади, которая выделяется в муниципальный жилищный фонд.

2. Размер жилой площади, обязательно выделяемой вновь для начальствующего состава Р. К. К. А. на основании п. 2 постановления ЦИК и СНК СССР от 16 февраля 1928 г. в пределах жилой площади коммунальных возводимых, капитально ремонтируемых и освобождающихся домов, по соглашению с исполнительными органами ведомства в зависимости от наличности начальствующего состава в данной местности и в домах жилищного фонда.

В счет вышеуказанной общей выделяемой для военного ведомства площади коммунального хозяйства обязаны взять на себя как отдельные дома, так и отдельные жилые дома.

3. Отдельные дома, закрепленные за военным ведомством (п. 2), ремонтируются, содержатся за его счет. Арендная плата за указанные дома взимается Комитетом военного ведомства только в сумме амортизационных отчислений в размере свыше 1,5 проц. строительной стоимости закрепленных домов в день сдачи. Арендная плата за дома, имеющие складочные помещения, устанавливается по соглашению с органами коммунального хозяйства в соответствии с общими законами. Передача военному ведомству закрепленных за ним домов производится по отдельным актам, в которых должны быть состояние этих домов. Ответственность за сохранение домов в исправности возлагается на Управление Начальника Снабжения Белорусского Военного Округа и его местных органов.

4. Квартирная плата за выделенные отдельные помещения в домах, занятых на военным ведомством, проживающими в них лицами начальствующего состава Красной армии.

5. Заселение предоставленных военному ведомству жилых площадей и закрепленных помещений производится в 20-дневный срок по приказам, издаваемым Управлением Начальника Снабжения Белорусского Военного Округа в лице его представителей на местах. Данные приказы должны регистрироваться в органах Коммунального хозяйства.

Примечание 1. Помещения, использованные военным ведомством в течение 20 дней после их предоставления, а также помещения освобожденные вновь не заселенные в продолжение того-же срока, возвращаются в коммунальный фонд для использования на общих основаниях.

Примечание 2. В случае, если установленных лицами начальствующего состава служебных в Рабоче-Крестьянской Красной армии занимаемые ими помещения в домах, полностью не закрепленных за военным ведомством, исключаются из числа помещений закрепленных за военным ведомством и переходят в общий коммунальный фонд.

6. Органам коммунального хозяйства надлежит право контроля за правильным использованием и содержанием домов, занятых за военным ведомством полностью или отдельных домов. В случае, если занятые отдельные дома будут использованы военным ведомством не полностью, или по назначению, окружные исполнительные комитеты вправе отнимать такие дома.

7. С опубликованием настоящего постановления отменяется постановление Экономического Совещания ЗСФСР от 29 м. 1927 г. «Об улучшении жилищных условий начальствующего состава Рабоче-Крестьянской Красной армии».

Председатель Экономического Совещания при СНК

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров

22

Заго Слуцкага гарэасэту. Бабруйскай акругі, [illegible] што 15-га сакавіка гэтага [illegible] у гарэ[illegible]

ТЭАТР-КІНО.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР.

Пятніца, 24 лютага „БОТВИН".

Білеты ў касе тэатру і камісійным магазыне (рог Левіск. і Камуністычнай 9-2).

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ „ХАЗ-ПУШ" ХУТКА! «Парижский сапожник». Звыш праграмы «КРЫМ ЗОВЕТ» Землятрасеньне ў Крыме.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „ПРОВОКАТОР" («У ПАУТИНЕ») драма ў 7 частках. Пачатак сэансаў у 6, 7 з пал., 9 і 10 з пал. гадз. веч.

КІНО «ПЛЕТА». БЫТАВЫ ФІЛЬМ „ОРДЕР НА ЖИЗНЬ" драма ў 6 част. Звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА САВКІНО (апошні выпуск). Пач. сэансаў у 7, 8-45 і 10 з пал. гадз. веч.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Толькі 3 дні — 24, 25 26 лютага — да дзяньня Чырвонай Арміі. „ДНІ БОРЬБЫ И П[illegible]

Лісты ў рэдакцыю.

Таварыш рэдактар!

Прашу надрукаваць маё кароткае заключнае слова адносна «Лекый па гісторыі беларускае мовы» дацэнта О. В.-Левановіча.

1) Адказ свой дацэнт О. В.-Левановіч таксама напісаў бязграматна і дазволіў сабе няпрыстойную выхадку проціў беларускага граматычнага тэрміну, што падкрэсьлівае яго неахайныя адносіны да беларускае мовы.

2) У сваім бязграматным, абразьлівым артыкуле ён ня даў ніводнага пранізьнага аказу на выстаўленыя мною пункты, бо замінуць сваю няграматнасьць на маньнікі—гэта не аргумэнт, а звальваньне сваёй віны на чужую галаву.

3) Калі-ж дацэнт В.-Левановіч напрабаваў спраўды зайці адказ на некаторыя, як яму здавалася, ляг